

ЧАРАЎНІЦЫ З БЕЛАВЕЖСКАГА



ПРАЎДА І МІФЫ ПРА ІМПЛАНТАЦЫЮ ЗУБОЎ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 верасня 2024 г.
СЕРАДА
№ 187 (30321)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

• Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў жніўні склала Br2341,2.

• Менш за 10 % фур ад нормы афармілі ў літоўскім пункце пропуску «Мядзінінкай».

• Надзвычайная пажарная небяспека (5-ы клас гарымасці) аб'яўлена на большай частцы тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

• Новы малочнатаварны комплекс адкрылі ў Нараўлянскім раёне.

• Забелін прызнаны найлепшым гульцом, Баркоўскі забіў самы прыгожы гол 22-га тура чэмпіянату Беларусі.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ХАМЕНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (на трэцім пленарным сегменце Саміту будучыні ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку):**

*«Беларусь упэўнена рухаецца наперад, нягледзячы на вялізныя перашкоды, якія для нас ствараюць краіны Захаду праз беспрэцэдэнтныя санкцыі. Няма ніякага сумнення ў тым, што санкцыі ўяўляюць сабой адну з самых сур'ёзных перашкод для ўстойлівага развіцця на планеце. Санкцыі парушаюць Статут ААН. Санкцыі падрываюць харчовую і экалагічную бяспеку, асабліва ў найменш развітых краінах. Санкцыі абмяжоўваюць доступ да фінансавых і таварных рынкаў, транспартнай інфраструктуры. Санкцыі — гэта шлях у тупік. Нарэшце, санкцыі супярэчаць разумнаму сэнсу».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба рыхтавацца да вайны. І дай Бог, каб гэтай вайны не было»

### Якія акцэнты расставіў Вярхоўны Галоўнакамандуючы ў пытаннях абароны краіны



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку ў Брэсцкую вобласць. Кіраўнік дзяржавы наведаў 230-ы агульнавайсковы палігон Абуз-Лясноўскі. У цэнтры ўвагі Галоўнакамандуючага — беспілотная авіяцыя. Тэма надзвычай актуальная, паколькі, як заўважыў Прэзідэнт, сучасная вайна — гэта вайна беспілотнікаў. «Сёння мы бачым, што без беспілотнікаў, БПЛА, няма вайны, — сказаў ён. — Без беспілотнікаў ні пра якую вайну, ні пра якую перамогу гаворкі няма. Яны ўжо занялі сваё месца, як контрбатарэйная барацьба, як сістэмы РЭБ супрацьдзеяння беспілотнікам». Кіраўніку дзяржавы далажылі, як беларускія Узброеныя Сілы плануюць развіваць і ўдасканальваць беспілотную авіяцыю з улікам сучасных узброеных канфліктаў. Галоўнае патрабаванне Прэзідэнта да дакладчыкаў — усё павінна быць натуральна, як у баі, без аніякай паказухі. Логіка цалкам зразумелая: у баі магчымасці патрэніравацца не будзе, звярнуў увагу беларускі лідар.**

#### «Трэба, каб усё было сваё»

Галоўнакамандуючаму прадэманстравалі айчынныя распрацоўкі ў сферы беспілотных лятальных апаратаў, у тым ліку расказалі аб навінках і дапрацоўках у ранейшых мадэлях. Арганізацыі, якія ўваходзяць у сістэму Дзяржкамваенпрама, і прадпрыемствы абароннага сектара эканомікі прадставілі больш за 30 адзінак тэхнікі ваеннага прызначэння айчыннай вытворчасці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў вытворчасці такіх сродкаў трэба максімальна арыентавацца на айчынныя камплектуючыя. «Трэба сваё. Трэба, каб было ўсё сваё», — падкрэсліў ён. У цэлым, задача ад кіраўніка дзяржавы — канкрэтна вызначыцца, якія менавіта мадэлі тэхнікі патрэбны Узброеным Сілам, колькі іх неабходна, якія прадпрыемствы будуць іх вырабляць. Аглядаючы кожны ўзор тэхнікі, ён удакладняў у міністра абароны, начальніка Генеральнага штаба, наколькі тая ці іншая мадэль неабходна нашым Узброеным Сілам, як яна зарэкамендавала сябе на практыцы. Ключавое патрабаванне — каб усё было надзейна і эфектыўна. І не ў дакладах, а на практыцы.

СТАР. 2




# Сумеснымі намаганнямі прадухіліць трагедыю

### 26 верасня пройдзе пад эгідай Адзінага дня бяспекі

**Па традыцыі ў чацвёрты чацвер верасня міністэрствы і ведамствы аб'ядноўваюцца для таго, каб сфарміраваць у грамадзян навыкі бяспечнай жыццядзейнасці. Гэтая работа, якая ўключае ў сябе і правядзенне адукацыйна-выхаваўчых мерапрыемстваў з удзелам падрастаючага пакалення, і прапаганду бяспечных умоў пражывання насельніцтва, праводзіцца пастаянна, але менавіта ў гэты дзень акцэнты гучаць найбольш гучна і канкрэтна. Усё для таго, каб кожны, хто калі-небудзь трапіць у надзвычайную сітуацыю, разумеў, якія дзеянні прадпрыняць, каб захаваць жыццё сабе і сваім блізкім.**

СТАР. 4



Фота з адкрытых крыніц.

Адукацыя

# ВОЛЬНЫ ЧАС — ЧАС ВУЧЫЦЦА

### У Беларусі больш чым 360 тысяч дзяцей і моладзі займаюцца ва ўстановах дадатковай адукацыі



**У нас даўно стала традыцыяй аддаваць у розныя секцыі, гурткі, клубы па інтарэсах дзяцей з самага ранняга ўзросту. І калі з колькасцю і нагрузкамі не перашчыраваць, справа гэта цалкам карысная. Па-першае, у вольны ад вучобы час дзіця, як гавораць, пры справе, а бацькі не турбуюцца за яго бяспеку. Па-другое, дзіця пераключаецца на іншы род дзейнасці і такім чынам адпачывае ад вучобы. Ну і па-трэцяе, для многіх хлопчыкаў і дзяўчынак дадатковая адукацыя становіцца пачаткам шляху ў адукацыю асноўную, а значыць, і прафесію.**

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X
24187
9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2024 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Трэба рыхтавацца да вайны. І дай Бог, каб гэтай вайны не было»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнту паказалі, як гэта тэхніка паводзіць сябе ў баі. На палігоне былі прадэманстраваны баявыя магчымасці айчынных перспектыўных узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі. Сярод іх і тыя адзінкі, якія былі прыняты на ўзбраенне ў гэтым годзе. Напрыклад, ударны беспілотны авіяцыйны комплекс (БАК) «Чакан-В» і шматфункцыянальны беспілотны авіяцыйны комплекс малой далёкасці «Беркут-3». Ударны БАК «Чакан В» распрацаваны ААТ «558 Авіяцыйны рамонтны завод» і прызначаны для пошуку, выяўлення і паражэння стацыянарных або маларухомых наземных аб'ектаў. Беспілотнікі, якія ўваходзяць у склад комплексу (іх можа быць ад 7 да 10), аднаразовага прымянення («камікадзэ») з далёкасцю дзеяння да 25 км. БАК малой далёкасці «Беркут-3» — гэта распрацоўка ААТ «АГАТ-сістэмы кіравання». Разведвальны комплекс прызначаны для вядзення паветранай оптыка-электроннай разведкі ў бачным і інфрачырвоным дыяпазонах днём і ноччу. Раней на ўзбраенне былі прыняты ўдарныя БАК «Квадра-1400» і «Баражавальная труба». Дзяржкамваенпрам арганізаваў іх серыйную вытворчасць. Узоры ВАК «Квадра-1400» і «Баражавальная труба» распрацаваны і серыйна вырабляюцца ААТ «Канструктарскае бюро «Дысплей». Яны прынятыя на ўзбраенне ў верасні 2022 года і пастаўляюцца ва Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь. Падчас розыгрышу практычнага эпізоду «Комплекснае баявое прымяненне сродкаў барацьбы з беспілотнікамі» Прэзідэнту прадставілі акрамя дзейнасці беспілотных авіяцыйных комплексаў таксама і работу вырабаў «Званок» і «Фумігатар». Яны ў эпізодзе дазволілі вайскоўцам своечасова выявіць і прадухіліць напады варожых БЛА на штурмавую групу і на санітарны аўтамабіль.

Як заявілі ў Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэце, дэманстрацыя чарговы раз паказала, што айчынныя распрацоўшчыкі ўзбраення трымаюць руку на пульсе часу і здольныя адказваць на сучасныя выклікі і пагрозы ваеннай бяспецы, садзейнічаючы вырашэнню баявых задач ва ўмовах вядзення сучаснага бою.



## «Беспілотнікі — справа сур'ёзная»

Сучасныя віды ўзбраення і падрыхтоўку кадраў, якія будуць з імі працаваць, а таксама падрыхтоўку людзей, здольных устаць на абарону сваёй краіны, абмеркавалі на нарадзе Прэзідэнта з ваеннымі. «Старая формула: хочаш міру — рыхтуйся да вайны. Хоць што нам тут перад кімсьці апраўдвацца, што мы не збіраемся ваяваць, што мы не жадаем ваяваць... Гэта ўсё ўжо сказана», — заўважыў ён. У той жа час, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, апаненты і праціўнікі, якія рыхтуюцца супраць нас ваяваць, сочаць за тым, што адбываецца ў Беларусі, і робяць сваю справу. «Трэба рыхтавацца да вайны. І дай Бог, каб гэтай вайны не было, — заўважыў Вярхоўны Галоўнакамандуючы. — Якой бы ні была вострая абстаноўка вакол Беларусі, мы пакуль не назіраем тэндэнцый да развязвання супраць нас вайны. Але, бачачы, як разгортваюцца падзеі на фронце ў суседняй дзяржаве і вывучаючы войны, якія здарыліся за апошнія гады ў свеце, мы ўжо рэфармавалі чатыры разы нашу армію. І ўжо, напэўна, пяты раз падыходзім да мадэрнізацыі Узброеных Сіл».

Адна з навінак у ваеннай сферы — беспілотнікі, без якіх, яшчэ раз звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, цяперашняя вайна не магчымая. «Так, беспілотнікі — гэта навінка, ды, мусіць, вайну (калі раптам здарыцца) яна назад не паверне, але значна паўплывае на ход ваенных дзеянняў. Беспілотнікі — справа сур'ёзная. Справа, як вайскоўцы кажуць, вельмі эфектыўная і выгадная з пункту гледжання вайны. Жудасна так казаць, але тым не менш. І сёння, як я ўжо гаварыў, ваюючыя бакі не шкадуюць беспілотнікаў для таго, каб паляваць на аднаго чалавека, таму што гэта танней, чым падрыхтаваць байца», — заўважыў Прэзідэнт.

Таксама Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для таго, каб супрацьстаяць беспілотнікам, за якімі, безумоўна, будучыня, трэба мець надзейную сістэму абароны, сістэму радыёэлектроннай барацьбы. І з гэтым у нашай краіне праблем няма, адпаведныя кампетэнцыі захаваліся яшчэ з савецкіх часоў. «Мы ведалі гэта даўно, гэта наша беларуская тэма. І ў Савецкім Саюзе мы былі на перадавых, і цяпер вельмі спатрэбілася, таму мы павінны і можам ствараць самыя сучасныя комплексы падаўлення беспілотных лятальных апаратаў і не толькі іх. Нямала зроблена, але яшчэ больш трэба зрабіць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на новы тэрмін — контрбатарэйная барацьба. Ён заўважыў, што гэта больш, чым тэрмін, — цэлы працэс у баі. «Цябе атакавала артылерыя, ты павінен імгненна пазначыць каардынаты, адкуль ты атакаваны, і адказаць, накрыць гэтую артылерыю, — удакладніў Аляксандр Лукашэнка. — Рабіць трэба хутка, але для гэтага трэба мець адпаведныя сістэмы і многае іншае, што дэманструе практыка бою, практычна ў нас за плотам».

## «Армію трэба прывесці ў ідэальны стан»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што кампактная, невялікая па колькасці насельніцтва Беларусь па эканамічных магчымасцях не зможа ўтрымліваць армію, якая патрэбна для вядзення вайны. Таму трэба прыстасоўвацца. Паводле слоў Прэзідэнта, для таго каб абараняць сваю краіну, трэба мець, найперш, народнае адзінства і дысцыпліну. «Гэта ў нас ёсць», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Таксама ён звярнуў увагу, што неабходна, з улікам асаблівасцяў сучаснага бою, звярнуць увагу на падрыхтоўку тэрытарыяльнай абароны. «І народнае апалчэнне, каб кожны дом мог абараніць чалавек, які не трапляе ў армію (пажылыя і гэтак далей), але які добра валодае зброяй. Сістэма ў нас вызначана, яна практычна створана. Мы яе правяраем», — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзяржсакратару Савета Бяспекі пастаўлена жалезная задача — усё праверыць, не для паказухі, пачынаючы ад народнага апалчэння да Узброеных Сіл. «Гэта значыць, сістэма абароны нашай краіны ў нас створана», — рэзюмаваў Прэзідэнт. Ён нагадаў пра сваю задачу паставіць на ўлік тых, хто служыў у спецыяльных падраздзяленнях сілавых ведамстваў і здольны і сёння эфектыўна ваяваць, абараняць краіну. «У найбліжэйшы час праверым усе падраздзяленні, — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Ён растлумачыў, што на падрыхтоўку спецпадраздзяленняў патрачаны вялікія грошы і падрыхтоўка гэтых людзей можа быць вельмі дарэчнай у няпросты час. Да абароны краіны варта прыцягнуць і паляўнічых, якія ўмеюць трымаць зброю ў руках. Члены таварыства паляўнічых і рыбаловаў да выканання адпаведных задач гатовы. «Паляўнічых у нас шмат, яны павінны мець сваё падраздзяленне са сваёй зброяй. Дзе мы падрыхтуем найлепшых снайпераў, чым у іх? Таму і гэта трэба выкарыстоўваць, па-гаспадарску трэба паставіцца», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не трэба разлічваць на савецкую практыку, калі выдзяляліся грошы, будаваліся ваенныя гарадкі, дзе збіралі шмат людзей і вучылі іх ваяваць. «Хлопцы, мы так эканоміку «пакладзём». У нас жабраком народ будзе хадзіць. Мы не можам вялікія грошы ўкладваць у такую сістэму падрыхтоўкі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Галоўнакамандуючы нагадаў пра сваю задачу ваенным падысці да перафарматавання навучання і падрыхтоўкі ў самой арміі, каб не было залішняй муштры, каб ваеннаслужачыя былі гатовы фізічна, з чым аказаліся невялікія праблемы. «Фізпадрыхтоўка, як і агнявая падрыхтоўка, павінна быць на першым месцы, як агнявая, тактычная, гэтак далей, як і вывучэнне сучасных відаў зброі, — запатрабаваў Галоўнакамандуючы. — Армію трэба ўзварушыць і прывесці яе ў ідэальны стан, пакуль у нас ёсць гэтае адзінства ў грамадстве і ёсць дысцыпліна». Ён заўважыў, што адказам на пытанне, зрабілі гэта ці яшчэ не, будзе «не».

Кіраўнік дзяржавы анансаваў, што, як толькі скончыцца сельскагаспадарчы сезон і будуць закрытыя іншыя пытанні, у асенне-зімовы перыяд, калі будзе больш часу, ваенных (не толькі армію, але таксама і розныя спецпадраздзяленні) МУС, КДБ чакае самая жорсткая праверка па ўсіх кірунках. «Усім нарэзаны задачы, усе ўсё ведаюць — трэба выконваць», — зрабіў акцэнт Галоўнакамандуючы. Таксама ён расказаў, што пры пошуку добрых спецыялістаў, здольных ваяваць, было вырашана стварыць яшчэ адно падраздзяленне з разумных, талковых, моцных людзей, але ўжо дарослых на кантрактнай аснове, якія прайшлі службу ў арміі або іншых падраздзяленнях.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
*Баранавіцкі раён.*

**Фота БелТА.**



Стратэгічны запас

# САЮЗ ФЕРМЕРА І ГАНДЛЯРА

## На нарадзе ў Брэсцкім раёне абмеркавалі пытанні фарміравання стабілізацыйных фондаў

**У канцы мінулага тыдня падчас наведвання фермерскай гаспадаркі кіраўнік дзяржавы вымавіў фразу, якую актыўна цытуюць не толькі медыя, але і вытворцы-аграрыі: «Галоўнае, каб мы перасталі кланяцца імпартнаму яблыку». Падобная ўстаноўка панавала і падчас рабочай нарады ў Брэсцкім раёне, дзе разглядалі пытаннні падыходаў да фарміравання стабілізацыйных фондаў.**

Удзельнікі нарады пабывалі ў садзе, пазнаёміліся з узорамі сельгаспрадукцыі, наведалі пладасховішча. У мерапрыемстве ўдзельнічалі намеснік прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей БАГДАНАЎ, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК. Тут жа былі вытворцы прадукцыі і прадстаўнікі гандлёвых арганізацый, якія маглі прыглядзецца адно да аднаго і дамовіцца аб пастаўцы яблыкаў, агародніны, бульбы на міжсезонны перыяд.

У самым пачатку размовы Юрый Шулейка заўважыў, што забеспячэнне ўнутранага рынку айчыннымі таварамі з'яўляецца стратэгіяй нашай дзяржавы, таму што ў нас усё для гэтага ёсць. «Бульбай, морквай, капустай, яблыкамі мы можам цалкам сябе забяспечыць, — сказаў віцэ-прэм'ер. — Гэтай прадукцыі ад айчыннага вытворцы павінна быць да 90, а то і 100 працэнтаў на паліцах магазінаў у міжсезонны перыяд».

Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Аляксей Багданаў паведаміў, што на абазначаны перыяд у Беларусі пакладуць у стабілізацыйныя фонды 121,1 тысячы тон плодаагароднінннай прадукцыі. Гэта своеасаблівы дзяржаўны заказ, які забяспечвае стабільныя пастаўкі на ўнутраны рынак названай прадукцыі. Сёння ідзе актыўная ўборка ўраджаю, прадукцыя змяшчаецца ў сховішчы. Адначасова вядзецца дагаварная работа. Бо механізм пастаўкі са сховішча ў гандлёвыя залы павінен быць загадзя адпрацаваны і выверыны.

На нарадзе падкрэслівалася, што асноўны аб'ём плодаагароднінннай прадукцыі ў краіне вырошчваюць фермеры. «Каля 70 працэнтаў аб'ёмаў вырошчваецца ў фермерскіх гаспадарках, — удакладніў міністр. — Бачым, што фермеры становяцца партнёрамі для нашага гандлю. А раней, як вядома, большую частку вырашчанага фермеры адпраўлялі на экспарт. У той жа час наш гандаль сядзеў на імпарце. Гэту сітуацыю ўжо тры гады таму мы павярнулі ў адваротны бок і бачым, як працэс ідзе ў станоўчым рэчышчы. У мінулым годзе па зніжках міжсезоннага перыяду аб'ёмы спажывання айчыннай плодаагароднінннай прадукцыі выраслі з 30 да 50 працэнтаў».


Фота БелТА

Падчас пленарнага пасяджэння Брэсцкая вобласць была названа флагманам па вырошчванні агародніны, фруктаў, бульбы. Тут вырошчваецца ад 30 да 60 працэнтаў розных відаў прадукцыі ад усяго рэспубліканскага аб'ёму. У рэгіёне больш за 14,4 тысячы тон бульбы, агародніны і яблыкаў пакладуць сёлета ў стабілізацыйны фонд. Ужо вызначаны 36 захавальнікаў гэтых фондаў. Праведзены абследаванні месцаў захоўвання, праводзіцца атэстацыя камер. Паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Брэсцкага аблвыканкама Ларысы Пісецкай, закладка будзе праведзена да 1 снежня, а да сярэдзіны лістапада павінны быць заключаны дагаворы з гандлёвымі сеткамі па выбарцы названай прадукцыі. Вось гэтай работай актыўна займаюцца цяпер фермеры рэгіёна.

Удзельнікі нарады наведалі яблыневы сад у Чарнаўчыцах. Асаблівая ўвага і на пленарным пасяджэнні — тэме яблыкаў. Брэсцкая вобласць вырошчвае палову аб'ёму пладоў па краіне. Юрый Шулейка звярнуў увагу на неабходнасць гнутка весці гэты кірунак: чаргаваць розныя тэрміны паспявання, расціць сарты, стойкія да захворванняў і прыстасаваныя да кліматычных асаблівасцяў. Апошняе патрэбна для таго, каб кампенсаваць страты, выкліканыя неўраджаем, перападам цэн, іншымі фактарамі. І ў Брэстчыны ёсць чаму павучыцца. Напрыклад, летась доля айчынных яблыкаў у аб'ёмах продажаў павялічылася з 56 да 77 працэнтаў.

Нездарма ж на нарадзе асаблівую ўвагу ўдзялілі саюзу фермерскіх гаспадарак з гандлёвымі арганізацыямі. На Брэстчыне ёсць раёны, у якіх фермеры вырошчваюць агародніну і фрукты ў прамысловых маштабах. Скажам, столінскія фермеры атрымліваюць 90 працэнтаў капусты ад абласнога паказчыка. А знакамітыя Альшаны пры неабходнасці па некаторых відах прадукцыі маглі б закрыць увесь стабілізацыйны фонд краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Напярэдадні

# МАШТАБНАЕ АБНАЎЛЕННЕ ДА ВЯЛІКАГА СВЯТА

## Да абласных «Дажынак-2024» у Бешанковічах добраўпарадкавалі каля сотні аб'ектаў



**Ужо ў гэту суботу Бешанковічы прымуць абласное свята паўночнага рэгіёна краіны — фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі-2024». Раённы цэнтр Віцебшчыны ў сувязі з гэтым істотна пахарашэў, тут абноўлена каля сотні аб'ектаў. Новыя дарожкі і тратуары, выкладзеныя пліткай, надаюць утульнасці як у цэнтры, так і на ўскраінах, жылыя шматкватэрныя дамы зіхацяць новай тынкоўкай і фарбай, істотна абноўлены фасады забудовы цэнтральнай плошчы, школ горада. Цэнтральны парк змяніўся да непазнавальнасці: ліхтары, скульптурная кампазіцыя, новыя дарожкі нагадваюць, што апынуліся вы ў часткі гістарычнага комплексу — палаца-паркавага ансамбля Храптовічаў... Як раённы цэнтр рыхтаваўся, каб стаць сталіцай свята аграрыяў, расказала старшыня Бешанковіцкага райвыканкама Галіна УНУКОВІЧ.**

***— Галіна Уладзіміраўна, колькі сродкаў затрачана на рамонтныя і падрыхтоўчыя работы да фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2024»?***

— Усяго на гэтыя мэты выдаткавана звыш 48 мільёнаў рублёў. Сярод самых затратных па часе і сродках аб'ектаў — добраўпарадкаванне цэнтральнага парку, капітальны і бягучы рамонт жылых дамоў, рамонт вулічна-дарожнай сеткі і цэнтральнай плошчы. Напрыклад, на рамонт вулічна-дарожнай сеткі раёна затрачана 2,2 мільёна рублёў, цэнтральнай плошчы — 291,5 тысячы рублёў, добраўпарадкаванне цэнтральнага парку — каля трох мільёнаў рублёў. Справіцца з такім аб'ёмам работ дапамагалі будаўнічыя брыгады з Віцебска, Баранавіч, Шуміліна.

***— Літаральна днямі рыхтуецца да адкрыцця своеасаблівы падарунак жыхарам раёна — новы разлікова-касавы цэнтр...***

— Новы аб'ект, камфортны для жыхароў горада, быў вельмі неабходны. Будаваўся цэнтр за сродкі «РУП «Віцебскэнерга». На будаўнічыя работы зрасходавана 3 мільёны 800 тысяч рублёў, на абсталяванне — 1,6 мільёна.

***— На цэнтральнай плошчы адрамантаваны будынкі раённага Дома культуры, раённага выканаўчага камітэта, суда і пракуратуры. Істотныя змены можна пабачыць і ў агульнаадукацыйнай школе № 1 і інш. Што палепшыцца для іх наведвальнікаў і работнікаў?***

— Сёлета праведзены маштабны рамонт аб'ектаў адукацыі. На гэтыя мэты было выдзелена больш за шэсць мільёнаў рублёў, з якіх 4 мільёны 320 тысяч рублёў — на правядзенне капітальнага рамонту з элементамі мадэрнізацыі сярэдняй школы № 1 імя І. І. Строчкі. Фасад быў уцеплены з нанясеннем ахоўна-дэкаратыўнай тынкоўкі і афарбаваны, заменены водаправодныя трубы ў падвальных памяшканнях, добраўпарадкавана тэрыторыя — устаноўлены бардзюры і ўкладзена тратуарная плітка, зманціраваны слупы вулічнага асвятлення, заменена агароджа па перыметры тэрыторыі. Акрамя гэтага, на тэрыторыі школы абсталяваны новы сучасны шматфункцыянальны стадыён са штучным пакрыццём, дзе змогуць займацца не толькі школьнікі, а ўсе жыхары прылеглага мікрараёна.

У цэлым праведзены бягучыя і капітальныя рамонтныя работы на шасці аб'ектах адукацыі. У трох установах дашкольнай адукацыі — бягучыя рамонты, у дзвюх установах агульнай сярэдняй адукацыі — капітальныя, а таксама бягучы рамонт будынка раённага вучэбна-метадычнага кабінета.

У раённым Доме культуры праведзены бягучы рамонт танцавальнай і глядзельнай залаў, хола, фасада, добраўпарадкавана тэрыторыя на агульную суму больш за 600 тысяч рублёў. Набытае сучаснае абсталяванне — гук, святло, святлодыёдны экран, мабільны камплект — дазволіць праводзіць мерапрыемствы любога плана і ўзроўню, глядзець фільмы ў добрай якасці.

***— Візітоўкай горада можна назваць сярэднюю школу № 2, якая рамантавалася з падтрымкай ураджэнца Бешанковіч, прадпрымальніка Аляксандра Яўневіча...***

— Гэты інвестыцыйны праект стаў добрым прыкладам дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва, калі аб'ядноўваюцца рэсурсы дзяржавы і бізнесу. Ён стаў рэалізоўвацца ў нашым раёне з 2022 года дзякуючы выпускніку гэтай школы 1976 года Аляксандру Анатольевічу Яўневічу, які сёння з'яўляецца старшынёй Савета дырэктараў ТАА «Максідом» (г. Санкт-Пецярбург) і зацікаўленасці ў яго рэалізацыі раённага выканаўчага камітэта.

Сёлета за кошт бюджэтных сродкаў у школу № 2 набыта новая мэбля і сучаснае абсталяванне на суму больш як 200 тысяч рублёў.

***— Рамонт закрануў і музычную школу. Наколькі складана было весці работы з улікам таго, што будынак з'яўляецца помнікам архітэктуры?***

— Рэканструкцыя гісторыка-культурнай каштоўнасці 2-й катэгорыі была распачата яшчэ ў 2015 годзе. Усе работы праводзіліся згодна з праектам, узгодненым з Мінкультам. Абноўлены ўсе памяшканні, фасад будынка, добраўпарадкавана тэрыторыя, заменены вокны, набыты новыя музычныя інструменты, абсталяванне для мастакоў і тэарэтыкаў, мэбля, абсталяваны санвузлы, душавыя і інш. Звонку гэта каларытны гістарычны палац са знакамітым балконам, ажурнымі ліхтарамі, масіўнымі лавачкамі, а знутры — сучасны будынак, камфортны для выхаванцаў і педагогаў.

***— Раскажыце аб праграме свята. Чым адметны будзе фестываль-кірмаш «Дажынкі-2024» у Бешанковічах?***

— Безумоўна, галоўная тэма і галоўныя героі свята — гэта сельскія працаўнікі, іх праца і клопаты. Аднак Бешанковічы змогуць здзівіць гасцей.

Напярэдадні свята пройдуць адкрыцці аб'ектаў інфраструктуры, святочны канцэрт з удзелам гурта «Дразды». На вячэрнім канцэрце выступяць пераможца і суперфіналістка Фактар.by Іван Дзятлаў і Маргарыта Шыбаева, калектыў «Чысты голас». Іван Дзятлаў выступіць сумесна з юнымі віяланчэлістамі — навучэнцамі нашай школы мастацтваў.

У рамках «Дажынак» адбудзецца раённае свята беларускай гасціннасці, кірмашовых забаў і майстроў сваёй справы «Бешанковіцкі раёк». Тут будуць працаваць «Музейны дворык», лаўкі майстроў народнай творчасці, сельсаветаў раёна. Адбудуцца народныя гулянні на пляцоўцы знакамітай Бакціхі — герані паэмы «Энеіда навыварат», якая трымала бровар у Бешанковічах, побач размесціцца «Трусіная сядзіба».

У год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на пляцоўцы перад раённым музеем мы з гонарам адкрываем бюст Героя Савецкага Саюза, першага сакратара падпольнага Бешанковіцкага райкама партыі і камандзіра партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь» Паўла Мінаевіча Раманава, пад кіраўніцтвам якога і вызваляліся Бешанковічы ў гады вайны. Пройдзе і ўрачыстая перадача памятных знакаў у месцы памяці сумеснага подзвігу беларусаў і расіян у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Геленджыку Краснадарскага краю Расійскай Федэрацыі.

Абавязкова наша свята наведае і гістарычны персанаж — граф Храптовіч, уладальнік маёнтка Бешанковічы ў XVIII стагоддзі, са світай. Незвычайным будзе адкрыццё першай у Бешанковіцкім раёне скульптурнай кампазіцыі, якая з'явіцца ў Цэнтральным парку канца XVII—XVIII стагоддзя — састаўной часткі ансамбля Храптовічаў. У самім парку будуць працаваць клубы гістарычнай рэканструкцыі.

У рамках «Дажынак» у Бешанковічах пройдуць абласныя конкурсы фальклорных калектываў «Галасы Радзімы» і гульнявых праграм «Вясёлкавы карагод».

Забаву, «ежу для душы» знойдзе любы ахвотны: дзеці, аматары спорту, музыкі, мастацтва, гісторыі, народных традыцый і смачных пачастункаў. Усіх гасцінна запрашаем на наша свята!

**Алена КРАВЕЦ.**

Медыясфера

# ЛЮДЗІ ПАВІННЫ ВАЛОДАЦЬ НАДЗЕЙНАЙ ІНФАРМАЦЫЯЙ

## Польскі экс-суддзя Томаш ШМІТ заявіў аб адкрыцці фонду «Польская праўда»

**Адной з галоўных задач фонду яго заснавальнік абазначыў давядзенне праўдзівай і дакладнай інфармацыі аб стане спраў як у Польшчы, так і ў Заходняй Еўропе ў цэлым. А з цягам часу тая інфармацыя будзе распаўсюджвацца не толькі ў краінах Еўропы, але і ў Азіі і Афрыцы. Акрамя таго, фонд будзе дапамагаць людзям, правы якіх парушаюцца на тэрыторыі Еўрасаюза.**

Па словах Томаша Шміта, «Польская праўда» будзе імкнуцца да ўсталявання і падтрымкі сяброўскіх сувязяў з прагрэсіўнымі замежнымі неўрадавымі арганізацыямі і асобнымі грамадзянамі. Вялікая ўвага — садзейнічанню ў пераадоленні сацыяльнай раз'яднанасці і нацыянальнай варожасці паміж дзяржавамі ЕС, Беларуссю і Расіяй. Прадстаўнікі фонду нацэлены браць удзел у інфармацыйных мерапрыемствах, аказваць грамадзянам Беларусі і Расіі садзейнічанне ў атрыманні кансультатыўнай і юрыдычнай дапамогі па пытаннях польскага заканадаўства, а таксама аказваць дапамогу асобам, якія ўціскаюцца за палітычныя погляды і перакананні ў Еўрасаюзе.

Томаш Шміт звярнуў увагу на тое, што ў Еўрасаюзе ўвогуле блакіруюць інфармацыйныя рэсурсы, якія ўтрымліваюць правільныя і правераныя звесткі. А заходнія СМІ выступаюць правадырамі інтарэсаў пэўных палітычных колаў або спецслужбаў. «Такім чынам, праўду можна перадаць толькі з Беларусі і Расіі», — падкрэсліў ён.



Фота БелТА.

Фонд «Польская праўда» створаны ў тым ліку і для таго, каб людзі маглі даведвацца аб дзейнасці еўрапейскіх і амерыканскіх палітыкаў, іх сувязях са спецслужбамі і аб іх карупцыі. Томаш Шміт зазначыў, што ўжо паўгода як ён жыве ў Беларусі, аднак сувязі з людзьмі ў Польшчы, Еўрасаюзе, ЗША не згубіў. «Інфармацыя адтуль паступае, але няма магчымасці перадаць яе далей. У мяне ёсць месенджары, розныя каналы сувязі, але гэта не тое, што трэба, каб інфармацыя спрацавала і мела ўплыў на ўнутраныя і палітычныя справы. І, вядома, на добрыя адносіны паміж Беларуссю, Расіяй і Польшчай. Па-мойму, гэта трэба рабіць праз фонд», — канстатаваў экс-суддзя.

Сярод іншага ён таксама заўважыў, што фонд «Польская праўда» будзе прасоўваць тых людзей, якія падтрымліваюць ідэі добрасуседства і міру. «Мы славяне, нам трэба супрацоўнічаць, і ўсе праблемы можна вырашыць. Вось сутнасць гэтых ідэй. Будзе весціся работа па зніжэнні ўплыву ЗША і Вялікабрытаніі», — падкрэсліў ён. А ў перспектыве ён разглядае фонд яшчэ і як пляцоўку для аб'яднання палякаў Беларусі, якая, акрамя іншага, стане месцам для перагавораў.

Аднак у першую чаргу для рэалізацыі гэтых планаў і вырашэння азначаных задач неабходна стварыць медыясферу не толькі на польскай мове, але і на рускай, беларускай, англійскай і нямецкай. «Трэба аб'яднаць усе сацыяльныя медыя. Але, зразумела, што пры трансляцыі інфармацыі мы будзем клапаціцца аб людзях, якія яе прадаставілі. Яны засталіся ў Польшчы, іншых краінах, і нельга дапусціць, каб у іх узнікалі праблемы», — сказаў Томаш Шміт і дадаў, што «Польская праўда» — гэта перш за ўсё людзі, з якімі ён супрацоўнічае.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

# Сумеснымі намаганнямі прадухіліць трагедыю



### ЭВАКУІРАВАЦЦА ПРАВІЛЬНА

Актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў, якія праводзяцца пад эгідай Адзінага дня бяспекі, традыцыйна з'яўляюцца ратавальнікі. Мерапрыемствы перш за ўсё накіраваны на фарміраванне ў грамадства культуры бяспекі жыццядзейнасці, навучанне насельніцтва правілам паводзін ва ўмовах розных надзвычайных сітуацый, асабліва пры пажары. Невыпадкова ў гэты дзень супрацоўнікі МНС наведаюць прадпрыемствы і арганізацыі, дзе правядуць трэніровачныя занятkі па эвакуацыі людзей з будынкаў падчас пажару. Менавіта ўзгаранні часцей за ўсё фіксуюцца ў зводцы ратавальнікаў. Вядома, гэтыя адважныя людзі заўсёды пасняхова і аператыўна спраўляюцца з вогненнай стыхіяй, але, различваючы на прафесіяналаў, нельга забываць і аб тым, што да прыбыцця ратавальнікаў, медыцынскіх работнікаў, міліцыі можна зрабіць самому. У першую чаргу дзеля таго, каб захаваць здароўе і жыццё сабе, сваім блізкім.

«Значнасць акцыі пацвярджаецца частымі памылкамі кіраўнікоў і персаналу пры планаванні і арганізацыі эвакуацыі, а таксама памылкамі наведвальнікаў аб'ектаў масавага знаходжання пры правядзенні эвакуацыі, — звяртае ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Так, за восем месяцаў бягучага года на аб'ектах арганізацый адбылося 322 пажары, на якіх шэсць чалавек загінулі, 16 атрымалі траўмы».

Згодна са сцэнарыем Адзінага дня бяспекі, галоўнымі выканаўцамі мерапрыемстваў стануць кіраўнікі арганізацый, незалежна ад форм уласнасці. Яны 26 верасня правядуць заняткі з работнікамі на працоўных месцах і давядуць да іх адпаведную інфармацыю аб парадку эвакуацыі, а таксама на практыцы адпрацуюць алгарытм дзеянняў пры эвакуацыі. У сувязі з гэтым на інтэрнэт-партале МНС падрыхтаваны і размешчаны метадычныя матэрыялы для кіраўнікоў у частцы тэарэтычнай і практычнай адпрацоўкі плана эвакуацыі пры пажары.

### АДПРАЦАВАЦЬ НАЙБОЛЬШ ЧАСТЫЯ СІТУАЦЫІ

Акрамя таго, 26 верасня ў мэтах навучання насельніцтва правілам бяспечных паводзін і правілам аказання першай дапамогі пры пажары ці іншай надзвычайнай сітуацыі МНС сумесна з МУС, Міністэрствам аховы здароўя і Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа будзе арганізаваны шэраг тэматычных інтэрактыўных пляцовак у месцах масавага знаходжання людзей. Спасылку на інтэрактыўную карту з указаннем месцаў і часу іх работы можна знайсці на сайце ратавальнага ведамства. Такія пляцоўкі размесцяцца паблізу месцаў масавага знаходжання людзей і будуць размешчаны на тых грамадзян, якія 26 верасня не апынуцца на працоўных месцах.

Як адзначыў **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення арганізацыі нагляду і прафілактыкі МНС Васіль СІЎЧАК,** актуальнасць навучання па гэтых пытаннях пацвярджаецца шматлікімі здарэннямі з масавай гібеллю людзей, якія адбыліся ў свеце. «Аналізуючы дадзеныя надзвычайных сітуацый, мы прыйшлі да высновы, што асноўнымі ўмовамі, якія прыводзяць да цяжкіх наступстваў, з'яўляюцца паніка, няправільныя дзеянні пры эвакуацыі, а таксама няўменне аказаць першую дапамогу пацярпеламу, — канкрэтызаваў ён. — Таму 26 верасня МНС рэкамендуе ўсім кіраўнікам арганізацый, незалежна ад формы ўласнасці, правесці навучанне ў сваіх калектывах. Пры навучанні калектыву неабходна выкарыстоўваць ролікі, якія больш наглядна паказваюць, як правільна сябе паводзіць ва ўмовах задымлення, у натоўпе і гэтак далей. Любы можа аказацца ў такой сітуацыі, калі яго жыццё, а таксама здароўе тых, хто знаходзіцца побач, будзе залежаць ад правільных дзеянняў. Таму да мерапрыемства трэба аднесціся максімальна адказна».

**Калі вы пачулі гук пажарнай сігналізацыі:**

- **не панікуйце;**
- **пакіньце памяшканне па эвакуацыйных знаках;**
- **патэлефануйце па нумары 112;**
- **выбірайце эвакуацыйныя выхады, якія знаходзяцца ў процілеглым баку ад дыму, прыгнуўшыся да падлогі і прыкрыўшы органы дыхання.**

### ПЛЯЦОЎКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І РАБОТА Ў ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАХ

Усяго ў гэты дзень пройдзе звыш 500 сумесных мерапрыемстваў. Па словах **намесніка начальніка аддзела арганізацыі работы ўчастковых інспектараў міліцыі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Юрыя ГУШЧЫ,** супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў унутраных спраў як аднаасобна, так і ў складзе міжведамасных рабочых груп у Адзіны дзень бяспекі пастараюцца наведаць усе аб'екты розных форм уласнасці, прыняць удзел у правядзенні інструктажоў з іх кіраўнікамі. Таксама міліцыянеры выступяць у працоўных калектывах, а таксама па месцы жыхарства грамадзян — з мэтай давядзення інфармацыі аб бяспечнай жыццядзейнасці.

**Генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ** паведаміў, што грамадскае аб'яднанне правядзе ў Адзіны дзень бяспекі больш за 350 мерапрыемстваў. «Па ўсёй краіне будзе арганізавана больш за 100 тэматычных пляцовак каля гандлёва-забаўляльных цэнтраў і іншых месцаў масавага знаходжання грамадзян, дзе мы будзем навучаць насельніцтва правілам аказання першай медыцынскай дапамогі, — удакладніў ён. — Таксама будзе працаваць больш за 100 інтэрактыўных пляцовак для дзяцей, бо правілы бяспекі трэба тлумачыць у любым узросце: хоць бы куды тэлефанаваць, бегчы і не панікаваць. Больш за 40 мерапрыемстваў у фармаце Дня адкрытых дзвярэй пройдуць у раённых арганізацыях Чырвонага Крыжа, запланавана каля 50 прафілактычных мерапрыемстваў у навучальных установах, а таксама каля 60 выступленняў у працоўных калектывах. Усім саставам мы будзем расказваць людзям, як неабходна дзейнічаць і аказваць самадапамогу, дапамагаць тым, хто знаходзіцца побач».

Дзмітрый Шаўцоў расказаў, што Беларускі Чырвоны Крыж падрыхтаваў розныя псіхалагічныя трэнінгі для грамадзян, бо галоўнае, па яго словах, у надзвычайнай сітуацыі — не паддацца паніцы і кантраляваць свае паводзіны.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

**Калі пачаўся пажар на працоўным месцы:**

- **не панікуйце, патэлефануйце па нумары 112;**
- **адключыце электрапрыборы;**
- **апавясціце аб пажары калег;**
- **па магчымасці скарыстайцеся вогнетушыцелем;**
- **пакіньце памяшканне.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# ВОЛЬНЫ ЧАС — ЧАС ВУЧЫЦЦА

## На любы густ

— У сістэме адукацыйнага ведамства працуе 252 установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. З іх 67 з'яўляюцца аднапрофільнымі і 185 — шматпрофільнымі. Толькі ў Мінску функцыянуюць 23 такія ўстановы, — расказвае **намеснік дырэктара УА «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Ганна АВЕРЫНА.** — Усе яны на слыху, у асаблівым прадстаўленні не маюць патрэбы. Гэта Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі, Мінскі дзяржаўны турысцка-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі, Мінскі гарадскі цэнтр фізічнага выхавання і спорту навучэнскай моладзі. У сістэме сталіцы таксама 11 раённых шматпрофільных устаноў дадатковай адукацыі і 9 раённых фізкультурна-спартыўных цэнтраў.

Наколькі разнастайны вольны час прапануюць сёння, гаворыць наступная лічба: праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі рэалізоўваецца па 15 профілях, ад тэхнічных да грамадскіх і гуманітарных. Асаблівым попытам карыстаюцца культурна-забаўляльны і ваенна-патрыятычны профілі. Усё больш моладзі аддаюць перавагу інтэлектуальна-пазнавальным, натуральна-матэматычным і грамадска-гуманітарным кірункам. Колькасць удзельнікаў аб'яднанняў па інтарэсах таксама ўражвае: іх больш за 360 тысяч.

— Кожнае трэцяе дзіця, а ў асобных рэгіёнах кожнае другое займаецца ў аб'яднаннях па інтарэсах, — канстатуе Ганна Аверына.

Па яе словах, дадатковая адукацыя адыгрывае вялікую ролю ў такой важнай справе, як выхаванне падрастаючага пакалення. Для гэтага сістэма мае шмат магчымасцяў: фестывалі, конкурсы, выставы, акцыі і іншыя маладзёжныя ініцыятывы.

## Выхоўваць патрыётаў

— Наша галоўная задача ў новым навучальным годзе — максімальна ўцягнуць навучэнцаў у дзейнасць па захаванні краязнаўчай, патрыятычнай і прыроднай спадчыны праз занятасць у аб'яднаннях па інтарэсах, практычныя справы і ўдзел у праектах, — кажа **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Вікторыя ПАШКО.** — Улічваючы, што сёлета



краіна адзначыла 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а ў наступным нас чакае юбілейны год Вялікай Перамогі, атрымае працяг развіццё сеткі аб'яднанняў па інтарэсах ваенна-патрыятычнага кірунку, а таксама па сучасных кірунках турысцка-краязнаўчай, экалага-біялагічнай дзейнасці. Работа аб'яднанняў па інтарэсах ваенна-патрыятычнага профілю будзе арганізоўвацца ва ўзаемадзеянні з воінскімі фарміраваннямі Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў, МНС, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта.

Яна адзначыла, што сёння асаблівую актуальнасць набывае музейная работа. Ва ўстановах адукацыі працуе больш за 1400 музеяў, 127 з іх — са статусам «народны». Але і гэта яшчэ не ўсё. Для юных краязнаўцаў рыхтуецца сапраўдны сюрпрыз — у краіне з'явіцца інтэрактыўная карта музеяў устаноў адукацыі. Вікторыя Вітальеўна крыху адсунула заслону гэтага сюрпрызу: «Цяпер мы актыўна працуем над завяршэннем карты. Яна з'явіцца ў найбліжэйшы час, будзе ў адкрытым доступе і зможа даць поўную разгорнутую інфармацыю аб тых музеях, якія цяпер вядуць сваю работу ў сістэме адукацыі. Там будуць размешчаны інтэрактыўныя спасылкі, дзякуючы якім наведвальнік зможа атрымаць усю неабходную інфармацыю аб музеі: яго кантактныя даныя, хто кіруе ўстановай, што ў ёй можна паглядзець, якія асаблівасці».

## Важкія пытанні

Яшчэ адзін цікавы праект цэнтра экалогіі і краязнаўства — «Зялёная школа». У яго ўцягнута больш за 700 устаноў адукацыі, працуе праект па шасці кірунках.

— Мы не можам заставацца ўбаку ад праблемы змены клімату, якая хвалюе ўвесь свет, і ўносім свой пасільны ўклад у захаванне кліматычных умоў, — дзеліцца наместнік дырэктара. — Распрацавалі «Кліматычную шкатулку», дзе змешчаны цэлы камплект тэматычных адукацыйных матэрыялаў. У асноўным у інтэрактыўнай і гульнявой формах. Гэта цікава, займальна і добра запамінаецца дзецьмі.

Актуальнай сёння застаецца яшчэ адна важная тэма — сельская гаспадарка. У кантэксце дадатко-



вай адукацыі для дзяцей і моладзі вырашаецца задача па фарміраванні правільнага стаўлення да найважнейшай з галін нашай эканомікі. А як гэта найлепш зрабіць? Вядома, праз уцягванне дзяцей у сельскагаспадарчую працу. Якраз цяпер, у рамках рэспубліканскага праекта «Сад мары», праходзіць маштабны збор пладова-ягадных культур. Навучэнцы разнастайных устаноў адукацыі займаюцца гэтым з задавальненнем і любоўю — ведаюць, што іх праца карысная для ўсіх.

— У Беларусі за ўстановамі адукацыі замацаваны ўчасткі, дзе вырошчваюцца пэўныя культуры, — распавядае Вікторыя Вітальеўна. — У некаторых школах маюцца нават уласныя ўчасткі пладова-ягадных садоў. Дзеці назіраюць за развіццём раслін, ростам і паспяваннем пладоў. Удзельнічаюць у іх зборы. Гэта вельмі карысны досвед, асабліва для тых, хто сваё жыццё вырашыў звязаць з агранаміяй.

...У тым, што большасць удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу «Юны натураліст», заключны этап якога пройдзе зусім хутка, практычна вызначыліся ў выбары свайго далейшага прафесійнага шляху, спецыялісты цэнтра не сумняваюцца.

— Гэта ўжо некалькі іншы ўзровень, чым проста догляд раслін, — тлумачыць намеснік дырэктара. — Бо асноўная мэта конкурсу — уцягнуць моладзь у даследчую, навуковую і праектную дзейнасць у галіне сельскай гаспадаркі і аграэкалогіі.

Работы сюды прадстаўляюцца сур'ёзныя, з навуковым абгрунтаваннем. Таму і ўзроставы цэнз там не дзіцячы, а хутчэй падлеткава-маладзёжны, ад 12 да 17 гадоў. Спаборнічаюць юныя аграрыі ў шасці намінацыях: «Актуальны агарод», «Падарунак настаўніку», «Казка аб любімым дрэве», «Аптэкарскі агарод — залог здароўя...», «У падарунак нашчадкам» і «Ураджай са знакам якасці». Пасля падвядзення вынікаў мы арганізуем выставу сельскагаспадарчай прадукцыі, якая была вырашчана ўдзельнікамі конкурсу.

## Высокія тэхналогіі

Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк — унікальная ўстанова дадатковай адукацыі. Штогод, пачынаючы з 2021 года, там арганізоўваецца 10 адукацыйных змен, па 24 дні кожная.

Трапіць сюды марацнь многія, але атрымліваецца ў самых адораных і мэтанакіраваных. На кожную адукацыйную змену тут набіраюць 150 вучняў старшых класаў. Спіс профіляў вялікі: «Зялёная хімія», «Інфармацыйныя і камп'ютарныя тэхналогіі», «Робататэхніка», «Інжынерная экалогія», «Біятэхналогія», «Нанаіндустрыя і нанатэхналогіі», «Энергетыка будучыні», «Электроніка і сувязь», «Архітэктура і дызайн», «Інфармацыйная бяспека», «Лазерныя тэхналогіі», «Авіякасмічныя тэхналогіі», «Віртуальная і дапоўненая рэальнасць», «Машыны і рухавікі. Аўтамабілебудаванне», «Прыродныя рэсурсы».

Пра найбольш запатрабаваныя з іх расказаў **загадчык аддзела рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі прыродазнаўча-матэматычнага профілю ўстановы адукацыі «Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк» Віталь СЦЕПАВЫ.**

— Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца такія напрамкі аб'яднанняў па інтарэсах, як робататэхніка, прататыпіраванне, праграмаванне, сеткавае і сістэмнае адміністраванне, інжынерны дызайн CAD, тэхналогіі беспілотных лятальных апаратаў, касманаўтыка і аэракасмічная тэхніка, вэб-тэхналогіі, графічны дызайн, радыёэлектроніка, гульнявая індустрыя. Не страчваюць актуальнасці і традыцыйныя: пачатковае тэхнічнае мадэляванне, трасавы мадэлізм, суднамадэляванне, авіямадэляванне, ракетамадэляванне, картынг, аўтамадэльны спорт і іншыя, якія складваліся дзесяцігоддзямі.

Як адзначыў загадчык аддзела, Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк фарміруе новае адукацыйнае асяроддзе, паэтапна ствараючы і развіваючы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі інжынерна-тэхнічныя цэнтры. На сёння іх у краіне 167. На базе цэнтраў праводзіцца 379 факультатыўных заняткаў, працуе 335 аб'яднанняў па інтарэсах тэхнічнай накіраванасці. А ахопліваюць гэтыя цэнтры больш за 4,5 тысячы навучэнцаў.

— Інжынерна-тэхнічныя цэнтры ў школах становяцца падмуркам для падрыхтоўкі высокаматываваных навучэнцаў для паступлення ў Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, — працягнуў Віталь Сцепавы. — Вектары і перспектывы развіцця дадатковай адукацыі тэхнічнай накіраванасці ў цяперашні час вызначаюцца ва ўзаемадзеянні з дадатковай адукацыяй адораных дзяцей і моладзі.

Адбор для навучання ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку юны саіскальнік праходзіць у некалькі этапаў. Спачатку ён павінен выканаць дзве важныя ўмовы: на сайце ўстановы дадатковай адукацыі запоўніць заяўку ў электронным выглядзе з указаннем жаданага напрамку навучання, а да яе прыкласці аўтарскі праект (работу) даследчага характару або дыплом пераможцы, удзельніка алімпіяды па вучэбных прадметах або адукацыйнага конкурсу як мінімум абласнога ўзроўню.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер Польшчы аб'явіў аб барацьбе з бабрамі



Выступаючы на сустрэчы крызіснага штаба, Дональд Туск адзначыў, што бабры наносяць шкоду дамбам на поўдні Польшчы. Пра гэта паведаміў польскі партал Onet. Прэм'ер заявіў, што праблема патрабуе хуткага вырашэння, і паабяцаў пачаць сапраўдную барацьбу з жывёламі: «Часам даводзіцца выбіраць паміж любоўю да жывёл і бяспекай гарадоў, вёсак і ўстойлівасцю дамбаў». Польскія эксперты адзначаюць, што праблемы ўрону для дамбаў ад баброў можна вырашыць, калі ўзвесці збудаванні далей ад рэк або пакрываць іх металічнай сеткай. Раней паведамлялася, што польскія ўлады ацанілі папярэднюю шкоду, нанесеную інфраструктуры і хатнім гаспадаркам пацярпелых ад паводак ваяводстваў, у 3,8 млрд злотых (каля $1 млрд). Непасрэдна пацярпелі ад паводак 57 тысяч чалавек, эвакуіраваны больш як 6 тыс. жыхароў. Паводле апошніх звестак, ахвярамі стыхіі сталі сем чалавек.

## Дзяржаўны доўг Францыі перавысіў тры трыльёны еўра



Эканоміка краіны знаходзіцца ў вельмі складанай сітуацыі. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на заяву прэм'ер-міністра Мішэля Барнье ў эфіры тэлеканала France 2. Па звестках канала, дзярждоўг Францыі складае амаль 3,16 трыльёна еўра. На яго абслугоўванне ідзе больш за 50 млрд еўра ў год. Кіраўнік французскага ўрада не выключыў павышэння падаткаў на даходы найбольш заможных французаў: «Я не буду выключаць, што ад найбольш забяспечаных суграмадзян можа спатрэбіцца ўдзел у мерах па нармалізацыі эканамічнай сітуацыі». Раней Елісейскі палац абнародаваў зацверджаны спіс новага кабінета міністраў, дзе пасаду міністра замежных спраў заняў Жан-Ноэль Баро. Пасаду міністра эканомікі заняў 33-гадовы Антуан Арман.

## ЗША прызналі найгоршай краінай у галіне аховы здароўя



Амерыканская сістэма аховы здароўя прызнана найгоршай сярод 10 развітых краін, паводле справаздачы некамерцыйнай арганізацыі ЗША Commonwealth Fund. Аб гэтым паведаміла Anadolu. Спецыялісты аналітычнага цэнтра параўналі сістэму аховы здароўя ЗША з сістэмай аховы здароўя Аўстраліі, Канады, Францыі, Германіі, Нідэрландаў, Новай Зеландыі, Вялікабрытаніі, Швецыі і Швейцарыі. Даследаванне паказала, што амерыканская сістэма дэманструе дрэнныя вынікі з пункту гледжання роўнасці ў доступе да медпаслуг, догляду і вынікаў лячэння. У тройку лідараў увайшлі сістэмы аховы здароўя Аўстраліі, Нідэрландаў і Вялікабрытаніі. «Я бачу адплату за гэтыя недахопы штодня. Ёсць пацыенты, якія не могуць дазволіць сабе лекі. Пажылыя пацыенты маюць сур'ёзныя запушчаныя захворванні з-за таго, што большую частку свайго жыцця яны правялі без страхоўкі», — заявіў кіраўнік фонду Джозэф Бетанкур.

# СЛУЖЭННЕ НА КАРЫСЦЬ ГРАМАДСТВА

## Праваслаўная Царква першай прайшла перарэгістрацыю

**У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці рэлігійных арганізацый» ад 30 снежня 2023 года раней зарэгістраваныя рэлігійныя арганізацыі павінны прывесці свае ўставы ў адпаведнасці з законам і прадставіць іх у рэгістрацыйныя органы для перарэгістрацыі. Беларуская праваслаўная царква першай з рэлігійных арганізацый завяршыла неабходныя працэдуры. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі за № 1 Мітрапаліту Мінскаму і Заслаўскаму Веніяміну, Патрыяршаму Экзарху ўсёе Беларусі.**

Як патлумачыў Аляксандр Румак, Нацыянальным сходам быў прыняты і ўступіў у сілу новы Закон «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях»: «Ім наша рэспубліка пацвердзіла канстытуцыйныя правы кожнага чалавека на свабоду выбару веравызнання. Адначасова законам замацавана тое, што дзяржава не можа ўскладаць на рэлігійныя арганізацыі выкананне якіх-небудзь абавязкаў. У той жа час закон утрымлівае патрабаванні, каб рэлігійныя арганізацыі ў сваёй дзейнасці не падвяргалі крытыцы суверэнітэт Рэспублікі Беларусь, унутраную і знешнюю палітыку краіны, каб рэлігійная дзейнасць не наносіла шкоды правам грамадзян, іх фізічнаму і псіхічнаму здароўю. Закон дакладна рэгулюе ўзаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый». Важнай навацыяй закона з'яўляецца ўключэнне рэлігійных арганізацый у адзіны рэгістр юрыдычных асоб у Рэспубліцы Беларусь. Дзякуючы ёй можна будзе атрымліваць інфармацыю і аб колькасці рэлігійных арганізацый, і аб іх становішчы.



Кірункі супрацоўніцтва дзяржавы і Беларускай праваслаўнай царквы вельмі разнастайныя. Як заўважыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, працай ахоплены ўсе пласты грамадзян — ад самых маленькіх да людзей шаноўнага ўзросту: «Гэта запыт нашага часу. Усе людзі маюць патрэбу ў духоўным асэнсаванні і падтрымцы. Уступленне ў сілу новага закона аб рэлігійных арганізацыях, адпаведна перарэгістрацыя і атрыманне новых дакументаў — сведчанне таму, што жыццё развіваецца. Сёння распрацоўваюцца новыя дакументы, якія датычацца нацыянальнай бяспекі, звязаныя з удасканаленнем сямейнай палітыкі, развіццём узаемадзеяння ў галіне культуры. Усе гэта знаходзіцца і ў сферы ўвагі Царквы. Таму для нас вельмі важны абноўлены дакумент, які вызначае параметры, у якіх Царква будзе здзяйсняць сваё служэнне грамадству, служэнне на карысць нашай дзяржавы».

Рэлігійныя арганізацыі павінны прадставіць дакументы для перарэгістрацыі не пазней за 5 ліпеня 2025 года. Да 1 студзеня 2026 года органы, якія рэгіструюць (Апарат упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, аблвыканкамы і Мінгарвыканкам), павінны ўнесці звесткі ў адзіны дзяржаўны рэгістр і тым самым завяршыць перарэгістрацыю рэлігійных арганізацый у нашай краіне. Як нагадаў Аляксандр Румак, падобную працэдуру раней прайшлі грамадскія аб'яднанні, палітычныя партыі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота аўтара.**

# ЗАХАВАЦЬ І ПАМНОЖЫЦЬ

## Абапірацца сёння трэба на спрадвечныя каштоўнасці

**Мы жывём у шматнацыянальнай, шматканфесійнай краіне, а таксама ў свеце, дзе некаторыя спрадвечныя асновы проста перакульваюцца з ног на галаву. Таму так важна захоўваць сваю культурную адметнасць, бараніць традыцыі і каштоўнасці, якія заўсёды былі і застаюцца фундаментам духоўна-маральнага развіцця нашага грамадства. Каб чарговы раз нагадаць пра гэта, у Доме прэсы прайшоў круглы стол «Нацыянальныя традыцыі і каштоўнасці як аснова духоўна-маральнага развіцця беларускага грамадства», дзе прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы, Міністэрства інфармацыі, Саюза пісьменнікаў Беларусі і Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў разам з журналістамі абмеркавалі найбольш вострыя і актуальныя тэмы, якія патрабуюць пільнасці і прапрацоўкі.**

—Як адзначыў наш Прэзідэнт, Беларусь — гэта краіна вялікай культуры, найбагацейшай гістарычнай спадчыны, шматвекавых духоўна-маральных традыцый і невычэрпнага творчага патэнцыялу. І гэта сапраўды так, таму што, прыязджаючы ў любы куток Беларусі, пераконваешся ў тым, што мы захавалі і помнікі нашай культуры, помнікі духоўнасці беларускай, — звярнуўся да прысутных **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** — Сёння адным з прыярытэтных кірункаў развіцця краіны на сучасным этапе з'яўляецца выхаванне грамадзян, асабліва моладзі, на традыцыйных каштоўнасцях беларускага народа. Таму што менавіта там адлюстраваны шматвекавы вопыт, духоўна-маральныя традыцыі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, якія вытрымалі выпрабаванне часам.

Па словах Аляксандра Румака, сёння складваецца якасна новая прастора ўзаемадзеяння інстытутаў адукацыі, улады, сям'і і Царквы як структур грамадства. І важна менавіта ўсім разам працаваць у вызначаным напрамку, каб быў вынік. Так, напрыклад, у Беларусі зноў працуе Грамадскі савет па маральнасці. Яго дзейнасць нацэлена на тое, каб прадстаўнікі грамадства давалі экспертную ацэнку тым з'явам нашага жыцця, якія з'яўляюцца спрэчнымі. Найперш якія датычацца ўплыву на падрастаючае пакаленне. Бо вельмі важна шырокім колам прыходзіць да згоды ў пытаннях, якія каштоўнасці могуць негатыўна адлюстроўвацца на выхаванні нашых дзяцей і моладзі. Абмяркоўваць і знаходзіць агульныя рашэнні.

**Першы намеснік старшыні ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», сакратар Грамадскага савета па маральнасці Алена СТЭЛЬМАХ** акцэнтавала ўвагу на тым, што сёння ўсё больш узрастае ў свеце цікавасць да нашай краіны, многія захапляюцца беларускім народам, а мы ў сваю чаргу працягваем выбудоўваць добрасуседскія адносіны з іншымі краінамі і народамі:

— Я таксама з упэўненасцю магу гаварыць пра тое, што стары лозунг, правераны часам — «Дружба літаратур і народаў», — вельмі актуальны і цяпер. Саюз пісьменнікаў мае дамовы з больш чым 30 арганізацыямі розных краін. Напрыклад, нядаўна мы заключылі дамову з Саюзам культурных дзеячаў Арменіі. Штомесяц праводзім анлайн-сустрэчы, міжнародныя круглыя сталы па самых розных пытаннях, якія хвалююць пісьменнікаў. А нас хвалюе тое, што хвалюе людзей: жыццё ва ўсіх яго праявах... Саюз пісьменнікаў таксама актыўна займаецца перакладамі, бо ў літаратуры гэта такія масткі сяброўства, якія дапамагаюць спазнаць душу народа, яго культуру і традыцыі. Мы перакладаем іншых і радуемся, калі перакладаюць нашых майстроў слова. А Грамадскі савет па маральнасці цяпер вялікую ўвагу ўдзяляе пытанню мовы маўлення. Брыдкаслоўе мы чуем нярэдка, і гэта тое, што не толькі непрыемна, але і ілюструе душу чалавека, яго стан думак. Таму, думаю, тут людзям патрэбна наша падтрымка.

**Алена ДРАПКО.**

Сугучча

# СЫШЛІСЯ РАЗАМ КОЛАС І КУПАЛА...

## У Татарстане працуе выстаўка Коласаўскага музея з Мінска

**Вядомы адрас літаратурнай памяці, мясціна, якая яднае, кліча ў госці беларусаў Казані і ўсяго Татарстана, — музей Янкі Купалы ў Пячышчах, блізкай ваколіцы Казані. Тут пры падтрымцы Аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі і ГПЗ «МТЗ — Татарстан» адкрылася выстаўка Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа «Якуб Колас і Янка Купала: зямля і неба беларускай літаратуры».**

На адкрыцці з прывітальным словам да прысутных звярнуўся кіраўнік Аддзялення Пасольства Беларусі ў Расіі ў Казані Віктар Шчэцька. Выступіў таксама і кіраўнік Выканаўчага камітэта Савета Асамблеі народаў Татарстана Рэнат Валіулін. Шчырымі словамі любові да беларускага народа, беларускай літаратуры было насычана выступленне народнага паэта Татарстана, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі, вядомага грамадскага і палітычнага дзеяча Рэната Харыса. Татарскі паэт і перакладчык зрабіў неверагодна шмат дзеля развіцця і ўмацавання беларуска-татарскіх літаратурных сувязяў, дзеля ўшанавання творчай спадчыны беларускіх класікаў на мове свайго народа. У 2018 годзе Рэнат Харыс выдаў у Казані зборнік беларускай паэзіі ў сваіх перакладах — «Калі ласка — Хуш кілесез!». Пад адной вокладкай знайшлося месца творам Францыска Скарыны, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Міхася Чарота, Уладзіміра Дубоўкі, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Рыгора Барадуліна, Раісы Баравіковай, Леаніда Галубовіча, Міхася Пазнякова, Валерыя Казакова, Міколы Мятліцкага, Уладзіміра Марука, Віктара Шніпа, Людмілы Рублеўскай, Алеся Бадака, Таццяны Сівец... Усяго 30 паэтаў Беларусі прадставіў чытачу татарскі перакладчык. Уражлівай аказалася і прадмова да кнігі, у якой, дарэчы, Рэнат Харыс напісаў: «Асаблівая цікавасць да Беларусі ўзнікла ў мяне недзе ў 1971 годзе ў перыяд работы адказным сакратаром Саюза пісьменнікаў Татарстана. Тады старшынёю Саюза пісьменнікаў Татарстана працаваў вядомы паэт Закі Нуры... Ён часта ўспамінаў пра сваё «лясное» жыццё ў час вайны, калі ён змагаўся супраць фашыстаў у партызанскім злучэнні Канстанціна Заслонава — спярша падрыўніком, пасля камандзірам атрада разведкі. Пра гэты перыяд свайго жыцця ён напісаў у кнізе апавяданняў «І мёртвыя помсцілі». Ганаровы грамадзянін горада Орша Закі Нуры заўсёды падтрымліваў кантакт з беларускімі пісьменнікамі, перакладаў на татарскую мову іх творы і выдаваў кнігі». І далей: «У тыя самыя гады ў вёсцы Пячышчы Верхне-Услонскага раёна на беразе Волгі адкрыўся музей Янкі Купалы, эвакуіраванага ў наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны. У з'яўленні гэтага музея таксама ёсць немалая заслуга Закі Шарафутдзінавіча. У гэтым музеі, праз жыццё і творчасць Янкі Купалы, для мяне шырэй адкрыліся дзверы ў свет беларускай літаратуры. Побач са знаёмымі па школьных падручніках Янкам Купалам і Якуба Коласам паўсталі Максім Танк, Пятрусь Броўка, Аркадзь Куляшоў і іншыя. Нябачаная бяда, прынесеная фашыстамі на беларускія землі, з неверагоднай сілай адлюстроўваецца ў іх творах іператвараецца ў гімн багатырскай трываласці і жыццялюбства беларускага народа».

З вялікай увагай усе слухалі выступленне дырэктара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Ірыны Мацкевіч, якая адзначыла непарушную еднасць двух класікаў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Ірына Уладзіміраўна падкрэсліла, што сяброўства ў межах музейнай прасторы Беларусі і Татарстана — гэта і мост, які развівае літаратурную, культурную, нарэшце, народную дыпламатыю паміж нашымі народамі. Прыемна, што ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь разумеюць надзвычайную вагу міжнародных стасункаў у галіне культуры. Вартае месца ў развіцці сяброўства, музейнага абмену паміж Беларуссю і рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі займае Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

— Калі гаварыць, у прыватнасці, пра Казань, музей у Пячышчах, — зазначае Ірына Мацкевіч, — то наша сяброўскае, шчырае партнёрства немагчымае без руплівасці кіраўніка гэтай установы Рымы Абызавай. Яна — часты госць у Беларусі, ініцыятар многіх творчых, асветніцкіх праектаў. Такія людзі культуры будуюць нашу еднасць, усталёўваюць прыязнасць і добрыя стасункі. Калі кантактуеш з Рымай Абызавай, адразу ўзнікае прыцягненне да Татарстана, Казані, да народа Татарстана...

Экскурсію па выстаўцы «Якуб Колас і Янка Купала: зямля і неба беларускай літаратуры» правяла навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Кацярына Саўчанка. А прадстаўнік беларускай суполкі ў Татарстане «Спадчына» Галіна Барановіч прачытала верш на роднай беларускай мове, а яшчэ падаравала музею ў Пячышчах ручнік, які быў вытканы сто гадоў назад. Кіраўнік «Спадчыны» Сяргей Марудзенка выказаў удзячнасць кіраўніцтву Беларусі і Татарстана за падтрымку і павагу да культурных узаемасувязяў паміж рэспублікамі і народамі. Уразіў чытаннем паэтычнага твора на беларускай мове і юны сябра музея, удзельнік многіх мерапрыемстваў у Купалаўскім доме ў Пячышчах Сяргей Бутэнка.

Падзея, што адбылася ў Тарастане, акрэсліла і магчымыя перспектывы развіцця культурных, літаратурных стасункаў. «З'яўляючыся членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, — падсумоўвае новы творчы праект Ірына Мацкевіч, — заклікаю сваіх калег па творчай арганізацыі не забывацца на клопат па ўшанаванні тых беларускіх літаратурных адрасоў, якія ёсць у свеце, якія служаць для нас напамінам, што беларускае мастацкае слова цікава ў многіх куточках. І не толькі ў Расіі, а і ў розных іншых краінах».

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

25 верасня 2024 г. № 36 (769 )

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ЭКАНАМІКС

# ЗАХАВАННЕ ЦЭНАВАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ, РОСТ ЗАРОБКАЎ БЮДЖЭТНІКАЎ

## На экспертным савеце ў Савеце Рэспублікі абмеркавалі прагнозныя дакументы на 2025 год



Фота БелТА.

**Сярод іх — праекты ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб найважнейшых паказчыках і параметрах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2025 год» і «Аб мэтавых паказчыках грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2025 год», праекты законаў «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год» і «Аб змяненні законаў», якія, у прыватнасці, прадугледжвае карэкціроўку Падатковага кодэкса.**





У разглядзе пытанняў, вынесеных на экспертны савет, удзельнічала шырокае кола экспертаў, якія прадстаўляюць эканамічны блок краіны. Як адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, гэтыя пытанні дастаткова маштабна ўжо абмяркоўваліся на пасяджэнні Савета Міністраў. «Думаю, вы ўжо пасвечаны ў тыя прагнозныя паказчыкі, якія прапануюцца ў 2025 годзе, але ў любым выпадку сёння мы запрасілі шырокае кола экспертаў для таго, каб вы выказалі сваё меркаванне: кіраўнікі мясцовых органаў улады, намеснікі старшыняў аблвыканкамаў», — звярнула ўвагу спікер.

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслава ТАТАРЫНОВІЧА**, гэтыя найважнейшыя па сваім змесце праекты нарматыўных актаў уносяцца на разгляд комплексным пакетным прынцыпам. «Мы ўсе цудоўна разумеем, што і меры бюджэтна-фінансавай палітыкі, і меры грашова-крэдытнай палітыкі павінны быць накіраваны на забеспячэнне фінансавай і цэнавай стабільнасці, — падкрэсліў ён. — Самае галоўнае — гэта стварэць умовы для далейшага паступальнага развіцця эканомікі нашай краіны. У сваю чаргу, стабільная работа эканомікі дазваляе фарміраваць планавыя паступленні ў даходы як рэспубліканскага, так і мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляць неабходнае фінансаванне нашых асноўных базавых расходаў. Тым больш праектам бюджэту прадугледжваецца далейшы рост і ўзроўню аплаты працы ў бюджэтным сектары, выкананне неабходных першачарговых расходаў, звязаных з выплатай іншых сацыяльных трансфертаў, выкананне абавязацельстваў па дзяржаўнай пазыцы. І, вядома, з улікам станоўчых тэмпаў работы эканомікі ў бягучым годзе (а гэта аснова для фарміравання паказчыкаў па тэмпах росту ВУП, інвестыцый, рэальных даходаў насельніцтва) у праекце бюджэту прадугледжваецца захаванне дастаткова высокага ўзроўню падтрымкі нацыянальнай эканомікі».

Члены экспертнага савета падышлі да абмеркавання прагнозных дакументаў на будучы год комплексна. «Акрамя названых і праектаў указаў, і праектаў заканадаўчых актаў, экспертаў цікавіць, якім чынам іх палажэнні будуць рэалізаваны ў далейшым, — патлумачыў сенатар. — Важна адзначыць, што ўсе рашэнні, па меркаванні экспертаў, павінны быць прыняты да пачатку 2025 года. Рэалізацыя на практыцы мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця прадугледжана праз комплекс мер, якія ўжо па практыцы будуць вызначаны ў рамках адпаведнай пастановы ўрада аб мэтавым плане».

Пазіцыя экспертаў, па словах Уладзіслава Татарыновіча, будзе з'яўляцца адной з падстаў для разгляду праектаў указаў і законаў непасрэдна ў кіраўніка дзяржавы. Пасля законапраекты будуць унесены на разгляд у парламент.

**Вераніка КАНЮТА.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# «Жанчыны павінны адстойваць ідэалы міру, сяброўства паміж усімі краінамі»

## Наталля КАЧАНАВА правяла сустрэчу са старшынёй Саюза жанчын В'етнама

Сустракаючы гасцей у Савеце Рэспублікі, Наталля Качанава адзначыла, што Беларусь і В'етнам звязваюць добрыя шчырыя сяброўскія адносіны. Яна звярнула ўвагу, што двухбаковае супрацоўніцтва развіваецца абсалютна па ўсіх кірунках. Аднак для парламентарыяў вельмі важным з'яўляецца міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «У той сітуацыі, якая цяпер адбываецца ў свеце, наша супрацоўніцтва павінна быць больш эфектыўным, — пераканана спікер. — Мы супрацоўнічаем з нашымі калегамі на міжнародных пляцоўках, і мы вельмі ўдзячны за вашу падтрымку. У нас у парламенце працуе група сяброўства. Спадзяюся, што будзем дастаткова эфектыўна працаваць, бо ўзаемныя візіты, якія прайшлі раней паміж нашымі парламентарыямі, вядома, даюць свае вынікі. Аднак сёння міжпарламенцкае супрацоўніцтва павінна быць больш інтэнсіўным».

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на міралюбнасці беларусаў. «Палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, — гэта перш за ўсё палітыка, накіраваная на павышэнне камфорту і дабрабыту нашых грамадзян, — падкрэсліла яна. — Самае галоўнае для нас (унутраная палітыка) — нашы людзі. Аб гэтым заўсёды кажа наш Прэзідэнт. Знешняя палітыка — гэта толькі міралюбнасць, добрыя адносіны з усімі краінамі, якія накіраваны на канструктыўнае супрацоўніцтва з нашай краінай. Мы ніколі нікому не пагражалі, ніколі не выступалі агрэсарамі і не будзем выступаць, але мы заўсёды будзем рабіць усё для таго, каб абараніць сваю суверэнную і незалежную краіну. Думаю, в'етнамскі народ у поўнай меры разумее, што такое жыць спакойна на сваёй зямлі. Вы таксама нацярпеліся вельмі моцна ў свой час ад той агрэсіі, якая была ў адносінах да народа і краіны ў цэлым. Таму, калі сёння на планеце з'яўляюцца новыя гарачыя кропкі, мы, беларускія жанчыны, больш актыўна ўключаемся ў адстойванне свабоды, міру і спакою на нашай планеце ў цэлым, не толькі ў сябе ў краіне».

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што інфармацыйныя тэхналогіі сёння дазваляюць праўду выдаваць за хлусню, а хлусню — за праўду, і толькі наведаўшы Беларусь, можна ў поўнай меры ацаніць, наколькі паспяховая наша краіна. «У нашай краіне людзі могуць вучыцца, жыць, працаваць спакойна, у нас шмат прадпрыемстваў, якія працуюць паспяхова, добрая сістэма сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі — усё тое, што патрэбна сучаснаму чалавеку, — канкрэтызавала яна. — Асаблівая ўвага ў нашай сацыяльнай палітыцы, вядома, удзяляецца жанчынам. Прэзідэнт нашай краіны так і кажа: «Я — жаночы Прэзідэнт». Ен робіць усё для таго, каб жанчына ў нашай краіне адчувала сябе самадастаткова. Тая падтрымка, якая аказваецца жанчынам, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, — гэта добры прыклад для многіх краін у свеце».

У сваю чаргу, старшыня Саюза жанчын В'етнама Ха Тхі Нга адзначыла, што дэлегацыя ўражана ўбачаным у Беларусі. «Мы крыху зайздросцім, што ваш народ жыве ў такой няпростай абстаноўцы і атрымлівае столькі дапамогі ад дзяржавы, — канкрэтызавала яна. — Ваш народ — вельмі шчаслівы, бо дзяржава клапоціцца аб народзе. Мы прайшлі многія войны і таксама вельмі шмат страцілі людзей, таму як ніколі разумеем цану міру. І мы таксама выстаялі, як і вы, перамаглі і цяпер як ніколі шануем мір на зямлі».

**Вераніка КАНЮТА.**

# Праекты — ад жыцця

## Як развіццё турыстычнага патэнцыялу матывуе вывучаць і захоўваць гістарычную спадчыну

**Напрацоўкі жыхароў Жыткавіцкага раёна ў гэтым кірунку вывучалі дэпутаты Гомельшчыны. Чарговы выязны семінар старшынь раённых Саветаў дэпутатаў рэгіёна прайшоў на тэрыторыі Ленінскага сельскага Савета дэпутатаў.**



Работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання па захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны і гістарычнай памяці. **Менавіта такую тэму прапанаваў Жыткавіцкі раён для правядзення семінара кіраўнікоў райсаветаў Гомельшчыны. Удзельнікаў сустрэчы прывіталі член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч, старшыня Жыткавіцкага райвыканкама Мікалай П'яўко і старшыня Жыткавіцкага раённага Савета дэпутатаў Леанід ВАЛАТОЎСКІ.**

Дэпутатаў сустрэлі ў аграгарадку Ленін. Населены пункт і ўласна сельсавет сваёй гістарычнай спадчынай — вядомыя ў раёне. Да 1939 года па тэрыторыі сельсавета праходзіла і граніца тэрыторыі БССР і «польскіх» земляў. Год таму ў аграгарадку Ленін быў устаноўлены памятны знак, прысвечаны падзеям 17 верасня 1939 года і ўз'яднанню заходніх і ўсходніх зямель Беларусі ў складзе БССР. Гэты праект удалося ўвасобіць у жыццё пры падтрымцы райвыканкама.

Памятны знак размясціўся ў скверы Народнага адзінства. Цяпер гэта мясцовы турыстычны брэнд. Новую зону адпачынку ў аграгарадку добраўпарадкавалі зусім нядаўна. Задуманае ўдалося ажыццявіць дзякуючы перамозе праекта ініцыятыўнай групы жыхароў аграгарадка Ленін у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. За сродкі гранта набылі саджанцы дрэў, лаўкі, сметніцы. За добраўпарадкаванне сквера ўзяліся талакой: правялі значную работу па абкошванні тэрыторыі агульнага карыстання, высечцы драўняна-хмызняковай расліннасці. Сквер, па задуме праекта грамадзянскай ініцыятывы, дапоўняць тэматычнымі стэндамі, элементамі азелянення і зонамі сямейнага адпачынку.

І гэта толькі частка праектаў добраўпарадкавання і развіцця патрыятычнага турызму, якія рэалізоўваюць мясцовыя жыхары. Старшыня Ленінскага сельскага Савета дэпутатаў Васіль Нямчэня звярнуў увагу дэпутатаў на дасягненні ў рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны. Як падкрэсліў Васіль Нямчэня, мясцовыя жыхары актыўна дапамагаюць вырашаць пытанні добраўпарадкавання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Далучаюцца як самі жыхары, так і арганізацыі.

— Людзі ставяцца з разуменнем. Дапамагаюць і нашы індывідуальныя прадпрымальнікі, — дадаў Васіль Нямчэня.

Па яго словах, жыхары населеных пунктаў сельсавета актыўна ўдзельнічаюць у зборы сродкаў самаабкладання, якія выкарыстоўваюцца для добраўпарадкавання.

Адным з аб'ектаў наведвання падчас семінара стаў краязнаўчы музей Ленінскай сярэдняй школы. Ён — таксама вядомы аб'ект унутранага турызму ў раёне. Падчас семінара дэпутаты пазнаёміліся з праектамі па грамадзянска-патрыятычным выхаванні, якія ажыццяўляюць дзеці, іх педагогі, бацькі. Загадчыца школьнага краязнаўчага музея Алена Русая распавяла, як дзякуючы дзейнасці школьнага краязнаўчага музея ўдаецца заахвочваць вывучаць гісторыю малой радзімы.

Падчас семінара дэпутаты наведалі памятны знак на месцы храма Раства Прасвятой Багародзіцы, пабудаванага ў вёсцы Ленін у 1879 годзе. У 1942-м царкву разам з мясцовымі жыхарамі спалілі нямецкія акупанты. Адноўлены храм цяпер знаходзіцца ў будынку пачатку XX стагоддзя. Яго настаяцель іерэй Дзмітрый Гулюта распавёў аб ролі духоўнага выхавання, сумеснай рабоце органаў мясцовай улады, насельніцтва і прыхаджан у захаванні гістарычнай памяці, цікавасці да вывучэння гісторыі населенага пункта.

— Удзельнікі мерапрыемства змаглі не толькі даведацца аб турыстычным патэнцыяле нашага раёна, але і ацаніць вопыт рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў на Жыткаўшчыне, — адзначыў падчас пленарнага пасяджэння семінара старшыня Жыткавіцкага раённага Савета дэпутатаў Леанід Валатоўскі.

Падвядзенне вынікаў сустрэчы, дарэчы, арганізавалі ў знакавым месцы для жыхароў Леніна. Тут па рацэ Случ да 1939 года якраз і праходзіла граніца паміж Усходняй і Заходняй Беларуссю. Старшыня Жыткавіцкага райсавета звярнуў увагу на выкарыстанне турыстычнага патэнцыялу населеных пунктаў раёна ў папулярызацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны і развіцці ўнутранага турызму.

— На тэрыторыі аграгарадка Леніна ў тым ліку знаходзяцца яўрэйскія магільныя пахаванні, якія датуюцца канцом XVI стагоддзя. На іх захаваліся старажытныя дубовыя надмагіллі — мацэвы, якім каля двухсот гадоў. Гэта таксама ўнікальныя аб'екты. Знакавы аб'ект гістарычнай спадчыны, канешне, патрабуе фінансавых укладанняў, каб развіваць яго далей, — адзначыў Леанід Валатоўскі. — Для развіцця турыстычнага патэнцыялу мы таксама распрацавалі веламаршрут па тэрыторыі аграгарадка Ленін. Між тым сёння ў раёне прадпрымальнікі пачалі развіваць сплавы на байдарках па Случы да Прыпяці. Гэтыя маршруты таксама ўлічваюць тыя гісторыка-культурныя лакацыі, якія цікавыя турыстам, — дадаў лідар дэпутацкага корпуса Жыткавіцкага раёна.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч падзякавала за ўнікальную магчымасць пабачыць, як жыхары раёна імкнуцца захоўваць і развіваць гісторыка-культурную спадчыну сваёй малой радзімы.

— У Гомельскай вобласці выязныя практычныя семінары з'яўляюцца пастаянна дзеючай навучальнай пляцоўкай для прадстаўнікоў органаў кіравання і самакіравання ўсіх узроўняў, — падкрэсліла Кацярына Зенкевіч.

Між тым падчас выязнога практычнага семінара член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні таксама правяла вучобу для старшынь Саветаў базавага ўзроўню па навацыях заканадаўства па пытаннях крымінальнай адказнасці.

— Як адзначыў Прэзідэнт на нарадзе 11 студзеня 2024 года, дзейнасць дзяржаўных органаў, грамадскіх інстытутаў павінна будавацца на прынцыпе справядлівасці, у тым ліку і крымінальнае права. Прапанаваныя нормы кодэкса па пытаннях крымінальнай адказнасці забяспечваюць баланс правоў і абавязкаў з адказнасцю за парушэнні заканадаўства. Дэпутаты абавязаны трансліраваць інфармацыю аб навацыях заканадаўства ў даступнай форме для сваіх выбаршчыкаў, — нагадала Кацярына Зенкевіч.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**

ПОВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

# «ГЭТА СУР'ЁЗНАЯ РАБОТА, ЯКАЯ

## З чым ідзе ў Маладзёжны савет

**У сталіцы прайшла другая сесія Маладзёжнага савета пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў. Маладзёжны савет — гэта пляцоўка для абмеркавання сацыяльных ініцыятыў і праектаў. У яго ўваходзяць ініцыятыўныя маладыя людзі сталіцы ва ўзросце ад 14 да 31 года. Сярод іх — школьнікі, студэнты сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, ВНУ, а таксама працоўная моладзь. Прыярытэтныя кірункі дзейнасці Маладзёжнага савета — грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, развіццё горада, адукацыя і прафарыентацыя. Ідэй у маладых людзей сапраўды шмат.**

Сёння Маладзёжны савет пры Мінгарсавеце аказвае садзейнічанне органам мясцовага самакіравання Мінска ў ажыццяўленні нарматыўна-прававога рэгулявання ў сферы маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі сталіцы, фарміруе ў моладзі прававую культуру і прававую свядомасць, садзейнічае ў аказанні сацыяльнай дапамогі, арганізоўвае ўзаемадзеянне з маладзёжнымі і грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі па пытаннях рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, а таксама арганізацыяй і правядзеннем мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю задач у сферы маладзёжнай палітыкі.

Звяртаючыся да членаў Маладзёжнага савета, **старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** падкрэсліў яго значнасць як платформы для падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў. Ён адзначыў, што гэта праца дазволіць маладым людзям атрымаць унікальны вопыт у галіне прыняцця рашэнняў і іх рэалізацыі. «Вы людзі неабыякавыя, адказныя, маеце сур'ёзны багаж ведаў і навыкаў. Вельмі важна працягваць сваё ўдасканаленне, працуючы ў Маладзёжным савеце. Гэта дасць вам магчымасць удзельнічаць у рэалізацыі розных праектаў, вырашаць важныя пытанні жыццезабеспячэння горада і сацыяльнай сферы», — сказаў мэр Мінска.



Уладзіслаў ДЗЕМІДЗЕНКА.

Кіраўнік горада дадаў, што будзе весціся работа над тым, каб члены Маладзёжнага савета пры Мінгарсавеце ўзаемадзейнічалі з раённымі адміністрацыямі. «Там шмат практычных ведаў, якія вам спатрэбяцца ў працы. Галоўная якасць кіраўніка — уменне працаваць з людзьмі. Тут вы атрымаеце такі навык. Са свайго боку мы зробім усё, каб праца ў Маладзёжным савеце была насычана яркімі падзеямі. Будзем прыцягваць вас да мерапрыемстваў, якія арганізоўваюцца ў горадзе. У нас шмат сур'ёзных праектаў, у тым ліку маладзёжных», — падкрэсліў Уладзімір Кухараў.

**Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН** адзначыў: «Сённяшні сход Маладзёжнага савета няпросты, сесія прысвечана выбарам старшыні і яго намеснікаў. Я пажадаў рабятам, каб іх выбар быў заснаваны не на эмоцыях, а на тых ацэнках, якія яны так ці інакш маглі даць сваім калегам, якія балатуюцца на гэтую пасаду», — падкрэсліў Арцём Цуран.

# «ВАЖНА, КАБ ЛЮДЗІ БАЧЫЛІ ДЫНАМІКУ»

## Чым можа ганарыцца Парэцкі сельскі Савет Гродзенскага раёна

**Аграгарадок Парэчча знакаміты сваёй гісторыяй. Праз населены пункт больш за паўтара стагоддзя таму прайшла першая ў Беларусі чыгунка. У старажытным будынку вакзала створаны адпаведны музей. Вядомыя гэтыя мясціны і сваёй аздараўленчай базай. На беразе возера Малочнае месціцца рэспубліканскі санаторый «Парэчча».**
**Мясцовыя ўлады клапоцяцца аб тым, каб кожны куток сельскага Савета быў прывабны. Таму тут актыўна вядзецца асваенне пустых зямель, ствараюцца камфортныя ўмовы для пражывання. Менавіта гэтыя аспекты трапілі ў зону ўвагі кіраўніцтва дэпутацкага корпуса Гродзенскай вобласці падчас выязнога семінара.**

### У звязцы з насельніцтвам

Парэцкі сельскі Савет самы вялікі ў Гродзенскім раёне. У склад яго ўваходзіць 27 населеных пунктаў, дзе пражывае 2800 чалавек. Таксама на тэрыторыі сельсавета знаходзіцца 25 садовых таварыстваў. Каб быў парадак, прыкладаецца нямала намаганняў. Некаторыя праблемы падказваюць самі жыхары. Па словах **старшыні сельвыканкама Андрэя МАЦКЕВІЧА**, ад грамадзян паступаюць звароты па пытаннях добраўпарадкавання і рамонту дарог. Але не толькі гэта хвалюе сялян. Было нямала зваротаў наконт паркоўкі каля дзіцячага садка ў аграгарадку Парэчча. Бацькі, якія прывозілі дзяцей у садок, не маглі паблізу пакінуць аўтамабіль. Цяпер тут з'явілася дзесяць парковачных месцаў.

— Праблема з паркоўкай была набалелым пытаннем. Ведаю яе не па чутках, бо жыву тут ужо 15 гадоў і трое маіх дзяцей хадзілі ў гэты садок. Пытанне абмяркоўвалі з загадчыцай садка, з бацькамі. Разам прыйшлі да высновы, што трэба абавязкова рабіць паркоўку, — расказаў Андрэй Мацкевіч. — У далейшым плануецца абсталяваць аўтастаянку каля сярэдняй школы.

Аграгарадок развіваецца, сюды прыязджаюць маладыя спецыялісты, многа і маладых сем'яў. Нядаўна ўведзены ў эксплуатацыю чарговы шматпавярховы дом, у якім 19 кватэр арэндныя. У доме жывуць дзевяць маладых спецыялістаў. Побач пабудавана спартыўная пляцоўка. Мясцовыя жыхары таксама падключыліся да добраўпарадкавання — пасадзілі туі, праводзяць азеляненне тэрыторыі. «Важна, каб людзі бачылі дынаміку, радаваліся, што вакол іх чыста і акуратна, і самі імкнуліся падтрымліваць парадак», — лічыць старшыня сельвыканкама.

### Конкурс як стымул для развіцця

Парэцкі сельскі Савет пад кіраўніцтвам Андрэя Мацкевіча неаднаразова выходзіў пераможцам у конкурсах. Так, у 2021 годзе заняў трэцяе месца ў конкурсе органаў мясцовага самакіравання Гродзенскай вобласці. У 2022 годзе — другое месца ў спаборніцтве сярод адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Гродзенскага раёна. Летась у гэтым конкурсе стаў абсалютным пераможцам. Тады ж сельвыканкам атрымаў і высокую ўзнагароду ў Рэспубліканскім аглядзе-конкурсе «Землекарыстанне высокай культуры земляробства, добраўпарадкаванне машынных двароў і фермаў».





За перамогу выдзелена парадку 58 тысяч рублёў. На гэтыя сродкі закуплена тэхніка, у прыватнасці матаблок з навясным абсталяваннем для чысткі дарог ад снегу, райдар для абкосу тэрыторыі, кустарэз, піла і газонакасілка — усё, што неабходна для работы па навядзенні парадку на зямлі.

### Адпачынак на прыродзе з камфортам

Парэцкі сельскі Савет цікавы і тым, што тут вялікі патэнцыял для развіцця турыстычнага кірунку. Актыўна развіваецца аграэкатурызм. Удзельнікі семінара пабывалі ў вёсцы Салацце, дзе паспяхова працуе аграсядзіба былога гараджаніна Юрыя Рэмшы. У свой час яго захапіла тутэйшая прырода, возера, лес. Вось і выбраў гэтыя мясціны для аграсядзібы, а потым і сам тут дом пабудаваў. Дарэчы, у вёсцы нямала велічных катэджаў. Відаць, многія аблюбавалі гэтыя мясціны, каб укласці сродкі ў нерухомасць. Па словах гаспадара, раней тут было шмат пустых дамоў, але цяпер такога няма. Амаль усе дамы прыдбаны, даглядаюцца альбо самімі месцічамі, альбо нашчадкамі, якія прыязджаюць сюды пастаянна і сочаць за парадкам.

Аб жаданні адкрыць аграсядзібу заявіў і гараджанін Аляксандр Астапчык. Кажа, што для сваёй справы разглядаў таксама Мінскую вобласць, але ў рэшце рэшт спыніўся на прыгранічнай вёсцы Запур'е — адной з аддаленых у Парэцкім сельскім Савеце. Атрымаў зямельны ўчастак, расчысціў яго, будуе аграсядзібу, на будучы год мяркуе прымаць гасцей. А цяпер тут пасялілася некалькі відаў экзатычных жывёл.

У сельскім Савеце свабодныя землі паспяхова асвойваюцца для вядзення падсобнай гаспадаркі. Напрыклад, Сяргей Далгашэй заняўся вырошчваннем буякоў. Ён адзін з першых, хто пачаў весці гэту справу на тэрыторыі сельскага Савета. Гадоў шэсць таму звярнуўся да старшыні з просьбай выдзеліць зямлю для развядзення ягадніку. «Занятак нялёгкі, — заўважае Сяргей, — патрэбен пільны нагляд, неабходна арганізаваць належны паліў, абрэзку. Але мы ўдзячны за аказаную дапамогу і маем магчымасць развіваць сваю справу».

### Брэнд сучасны і гістарычны

— Мы выбралі для наведвання Парэцкі сельсавет невыпадкова, — падкрэсліла **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена ПАСЮТА**. — Тут няма такой вытворчасці, дзе задзейнічана шмат людзей, пераважная большасць насельніцтва працуе ў сацыяльнай сферы. Разам з тым бачым, што тэрыторыя паспяхова асвойваецца, вядзецца добраўпарадкаванне населеных пунктаў — тое, на што цяпер варта ўсім звярнуць увагу на месцах. У гэтым сэнсе Парэцкаму сельсавету ёсць чым ганарыцца. Варта адзначыць і асабісты падыход у рабоце старшыні сельскага Савета, які накіраваны на развіццё населеных пунктаў, выкарыстоўвае сучасныя падыходы з добрым вынікам.

Дэпутаты таксама адзначылі паслядоўнасць у захаванні гістарычнай спадчыны. Аграгарадок Парэчча стаў першым міжнародным маршрутам, які пракладзены на беларускіх землях падчас будаўніцтва магістралі Санкт-Пецярбург — Варшава, рух па якой быў адкрыты ў 1862 годзе. З тых часоў тут захаваўся чыгуначны вакзал, дзе нядаўна быў адкрыты ўнікальны музей. На прывакзальнай плошчы ўстаноўлена міні-мадэль першага паравоза. Менавіта свята вакзала стала брэндавым у аграгарадку і адзначаецца напрыканцы жніўня. Па ўсім відаць, што старшыня Парэцкага сельскага Савета Андрэй Мацкевіч імкнецца зрабіць усё магчымае, каб жыхары населеных пунктаў з задавальненнем жылі і працавалі на сваёй зямлі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і аўтара.**

# ПАТРАБУЕ ПОЎНАЙ САМААДДАЧЫ»

## актыўная сталічная моладзь

Члены Маладзёжнага савета нярэдка бяруць удзел у правядзенні прамых тэлефонных ліній, асабістых прыёмаў грамадзян, часта з'яўляюцца арганізатарамі круглых сталоў, розных дыялогавых пляцовак, становяцца арганізатарамі масавых мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі сталіцы. Так, напрыклад, **член Маладзёжнага савета пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў Наталля ЧАЙКОЎСКАЯ** працуе на розных пасадах, у тым ліку ў паліклініцы. «Я лічу, што Маладзёжны савет можа станоўча паўплываць на змены ў структуры аховы здароўя. І я наогул за тое, каб маладыя людзі праяўлялі актыўнасць, выхоўвалі патрыятычнасць і змянілі нашу Беларусь у лепшы бок», — адзначыла дзяўчына.

Па выніках адкрытага галасавання **новым старшынёй Маладзёжнага савета пры Мінгарсавеце стаў Уладзіслаў ДЗЕМІДЗЕНКА**.

Нававыбраны старшыня — актыўны малады лідар, які ўжо зарэкамендаваў сябе ў грамадскай дзейнасці. Уладзіславу 25 гадоў, ён працуе намеснікам галоўнага бухгалтара на Мінскім халадакамбінаце № 2. Малады чалавек не хавае, што рашэнне балатавацца на пасаду старшыні было ўзважаным і адказным крокам. «Гэта сур'ёзная работа, якая патрабуе поўнай самааддачы, — адзначыў новы старшыня Маладзёжнага савета пры Мінгарсавеце Уладзіслаў Дземідзенка. — Акрамя асноўнай працы, я гатовы ўзяць на сябе дадатковыя абавязкі, бо разумею важнасць гэтай задачы. Будзем працаваць не толькі на карысць горада, але і ўсёй краіны. У нас ёсць маса ідэй, якія плануем абмеркаваць і рэалізаваць. Гэтыя ініцыятывы дапамогуць палепшыць жыццё ў Мінску і зробяць наш горад яшчэ больш камфортным для жыхароў. Ужо ў найбліжэйшы час плануем сустрэцца з мэрам горада, каб прадставіць нашы прапановы».



Уладзіслаў Дземідзенка разумее, што лёгка не будзе: «Чакаю, што мы з калектывам пакажам поўную самааддачу, будзем працаваць на карысць горада і ўсёй дзяржавы».

Таксама выбралі двух намеснікаў старшыні Маладзёжнага савета пры Мінгарсавеце. Імі сталі Юлія Кунахавец, загадчык сектара па рабоце са СМІ галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама, і магістрант першага курса факультэта міжнародных адносін БДУ Стэфанія-Віталія Віннічак.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота «Мінск-Навіны».**

# РАСНА «ДАЖЫНКАМІ» КРАСНА

## Як добраўпарадкавалі і паднаўлялі вядомы населены пункт на Камянеччыне

**Агрagarадок Расна мае працяглую і даволі цікавую гісторыю. З часоў Сярэднявечча тут узводзілі маёнткі і культавыя пабудовы. За пяць стагоддзяў шмат разоў мяняліся гаспадары тутэйшых земляў, а вось славутасці час не пашкадаваў. У сярэдзіне XX стагоддзя ў Расне не засталося амаль нічога ад былых помнікаў гісторыі і архітэктуры. Да 1960-х гадоў датрымалася толькі праваслаўная царква Міхаіла Архангела, і тую разабралі ваяўнічыя атэісты.**

Недзе з пачатку 1970-х гадоў вёска пачала актыўна адбудоўвацца дзякуючы знакамітай гаспадарцы «Савецкая Беларусь», якую ўзначальваў двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Бядуля. У цэнтры населенага пункта вырас дыхтоўны па тым часе Дом культуры, у якім выступалі зоркі савецкай эстрады, нават аднойчы «Песню года» запісвалі. Функцыянавалі самыя розныя сацыяльныя аб'екты, таму не дзіва, што ў гэтай вёсцы тады і свой рэстаран адкрылі. Узводзілася добраўпарадкаванае жыллё, развіваліся гандаль і бытавое абслугоўванне.

Але сышоў Бядуля, памянялася эпоха, перастаў існаваць некалі праслаўлены калгас. Паступова прыходзіла ў заняпад і вясковая інфраструктура.

Надаць пэўны імпульс знешняму выгляду шляхам добраўпарадкавання па добрай традыцыі вырашылі «Дажынкамі». Менавіта на гэты год Расна вызначылі месцам правядзення раённага свята ўраджаю. Падрыхтоўка, як заўсёды, пачалася з вясны. У райвыканкаме быў складзены план, вызначаны адказныя, выдзелены сродкі, і працэс пайшоў.

— Увесь час з пачатку года на месцы пастаянна праводзіліся пасяджэнні раённага штаба па пытаннях падрыхтоўкі да раённых «Дажынак», — расказала карэспандэнту газеты **старшыня Расненскага сельскага Савета Аляксандра СІНЯЎСКАЯ**. — Пачыналі са знешняга выгляду. Першым і самым галоўным аб'ектам стала плошча перад Домам культуры. Спачатку былі заменены інжынерныя камунікацыі, затым укладзена плітка. І адразу плошча зайграла бляскам, набыла рысы навізны. Тым часам абсталявалі пад'язныя шляхі да школы і дзіцячага садка, якія знаходзяцца паблізу. Такім чынам стаў вымалёўвацца больш выразны цэнтр населенага пункта. Мадэрнізавалі старыя клумбы і разбілі новыя. Па перыметры паставілі лаўкі, якія падарылі сельгаспрадпрыемствы раёна.



Старшыня сельскага Савета Ганна СІНЯЎСКАЯ на абноўленай вуліцы.

На аб'екце шчыравалі дарожнікі: заасфальтавалі ладныя ўчасткі вуліц Паўночнай і Юбілейнай. Ад плошчы да школы цяпер пракладзена пешаходная дарожка. Ліхтары заменены на святлодыёдныя — цяпер у вячэрні і начны час цэнтр добра асвятляецца.

Рамонт і абнаўленне пеажылі шэраг сацыяльных аб'ектаў. Добраўпарадкавана тэрыторыя вакол школы, знутры таксама праведзены рамонт. На першым паверсе заменены дзверы, абсталяваны два кабінеты дапрызыўнай падрыхтоўкі. Там будуць праводзіцца заняткі для старшакласнікаў школ высокаўскай зоны, для гэтага ёсць усё неабходнае. Рамонт быў праведзены і ў дзіцячым садку.

Абноўлены гандлёвыя пункты населенага пункта. У магазіне «Родны кут» заменена гандлёвае і халадзільнае абсталяванне. Спецыялізаваны магазін ААТ «Белавежскі» перанесены ў новы будынак, дзе прадпрыемства папярэдне правяло рамонт, памяняла дызайн і абсталяванне. Цяпер тут прадаюць не толькі свежую прадукцыю, паўфабрыкаты, але і нават свой фірмовы хлеб. У былым рэстаране праведзены рамонт, памяшканне пераабсталявана пад гасцінічныя нумары.

Вялікую работу па добраўпарадкаванні правяло сельгаспрадпрыемства «Белавежскі». Абноўлены адміністрацыйны будынак, які цяпер належыць гаспадарцы, ну, і самую вялікую спонсарскую дапамогу аказала менавіта гэтае прадпрыемства.

«Дажынкі» прайшлі, а работа працягваецца. Вядзецца ўцяпленне шматкватэрнага жылога дома па вуліцы Юбілейнай. Яшчэ добраўпарадкоўваецца тэрыторыя вакол возера. Некалі гэта была добрая зона адпачынку. «Белавежскі» пачысціў сам вадаём і прыбраў лішнюю расліннасць вакол. Да вясны мясцовая ўлада мае намер уладкаваць тэрыторыю.

**Старшыня Камянецкага раённага Савета Аксана ВЫСАГРОЦКАЯ** заўважае:

— Адной з самых няпростых задач у працэсе падрыхтоўкі аказалася змяніць настрой людзей, заахвоціць іх прыняць удзел у навядзенні прыгажосці. Праводзілі сельскія сходы, размаўлялі з кожным паасобку, пераконвалі, прасілі, агітавалі. І калі напачатку адчуваўся пэўны скепсіс у некаторых жыхароў, то паступова сталі ў працэс уцягвацца. Станоўчую ролю адыграў прыклад актывістаў. І многае ўдалося зрабіць талакой. Напрыклад, навесці парадак вакол гаражоў, узведзеных даўным-даўно. Потым вяскоўцы пафарбавалі дамы на цэнтральнай вуліцы, бялілі падмуркі і агароджу, упрыгожвалі балконы. Сталым дапамагалі прадстаўнікі раённых грамадскіх арганізацый. Трэба аддаць належнае мясцовай уладзе: яны арганізоўвалі суботнікі, самі паказвалі прыклад. Ударна папрацавалі работнікі школы і садка, іншых сацыяльных устаноў. І цяпер людзі ацанілі работу. Выходзяць вечарамі гуляць, сядзяць на лаўачках і гавораць аб тым, як прыгожа стала ў Расне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

# Чараўніцы з Белавежскага

## Аб'яднанне вясковых творчых людзей атрымала афіцыйны статус

**Творчасць заўсёды вельмі індывідуальная. Як вядома, творчы чалавек — асоба са сваім бачаннем свету, сваёй манерай работы. Інакш і быць не можа. А вось прапагандаваць сваю творчасць, паказваць сябе, у рэшце рэшт, прадаваць свае творы лепей атрымліваецца разам. Да такой высновы аднойчы прыйшлі майстры розных жанраў і кірункаў з пасёлка Белавежскага і зарэгістравалі творчае аб'яднанне «Белавежскія чараўніцы».**

Што чараўніцы, то чараўніцы — каб упэўніцца ў гэтым, варта толькі паглядзець іх маленькую выставу, якая знаходзіцца ў дзіцячай школе мастацтваў. Жывапісныя творы, вырабы з дрэва ды іншых самых розных матэрыялаў адлюстроўваюць характар прыроды і светапогляд аўтараў. Душой гэтага аб'яднання, відаць, можна лічыць **Таццяну ЗАГАРОЎСКУЮ**. Не так даўно Таццяна Віктараўна стала дырэктарам названай школы, а выкладчыкам працуе ў ёй шмат гадоў. Яна навучае дзетак выяўленчаму мастацтву, праводзіць майстар-класы па батанічным барэльефе для дарослых. А вось для сябе, для душы піша карціны.



Таццяна ЗАГАРОЎСКАЯ.

А вось **Алена КУЗУБ** робіць лялькі, стварае навагоднія цацкі, вырабы з пап'е-машэ. Алена Мікалаеўна не мае мастацкай адукацыі. Працуе ў аддзеле кадраў ААТ «Белавежскі». Творчасцю займаецца ў вольны час. Лялькі жанчына шые, колькі сябе помніць. Гаворыць, што гэта ад маці: «Мая мама працавала краўчыхай. Ну і я шыла, можна сказаць, з дзяцінства. Спачатку адзенне для лялек, ну а потым непасрэдна лялькі. Аднойчы са сваімі дзецьмі вырашылі ўпрыгожыць навагоднюю ёлку ўласнымі цацкамі. Сталі іх выраблць, і аказалася, што ў гэтай справе няма мяжы творчасці... Мне падабаецца, што ў гэтай рабоце можна адысці ад рэальнасці, перанесціся ў казачны свет і рабіць яго такім, якім хочаш».

Яшчэ ў складзе «Белавежскіх чараўніц» ёсць майстар вышыванкі, адна жанчына займаецца мастацкім вязаннем — усяго каля дзесяці чалавек. Разам яны бываюць на фестывалях і кірмашах. На раённых «Дажынках» гэтага года падворак «Чараўніц» заняў трэцяе месца. Паспяхова выступілі на фестывалі «Вясновы вянок» у Мінску.



Алена КУЗУБ.

Ідэя афарміць і зарэгістраваць творчае аб'яднанне належыць тагачаснаму дырэктару школы мастацтваў, цяперашняму **старшыні Белавежскага сельскага Савета Ганне ЧАПЯЛЮК**. Яна рыхтавала ўсе дакументы, праходзіла ўзгадненні, і шэсць гадоў таму «Белавежскія чараўніцы» атрымалі афіцыйны статус.

— Творчае аб'яднанне патрэбна для таго, каб збірацца разам, абменьвацца ідэямі, думкамі, афармляць іх у пэўныя ініцыятывы, а потым праводзіць у жыццё, — гаворыць Ганна Чапялюк. — Напрыклад, разам упрыгожваем будынак да Новага года, да Вośмага сакавіка, іншых свят. І тут ужо ёсць месца крэатыву, ідэям. Шмат гадоў мы з радасцю гэта робім для ўсіх. Апошняе, відаць, і дало штуршок для аб'яднання. А афіцыйны статус накладвае пэўную адказнасць, трэба ўвесь час трымаць марку. Напрыклад, цяпер працуем над канцэпцыяй навагодняга ўпрыгожвання не толькі памяшкання школы мастацтваў, але і ўсяго пасёлка. І робім гэта з задавальненнем.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.802. Нумар падпісаны ў 19.30 24 верасня 2024 года.**

Мы і свет

# ШТО ПЕРАДАЕЦЦА Ў СПАДЧЫНУ,

## альбо Госцю рады былі ўсе

**Для пачатку — трохі пра сябе. З газетай «Звязда» я сябрую даўно, з задавальненнем чытаю і сама вось хачу напісаць, што сорак гадоў працавала настаўніцай у Лельчыцкай СШ № 2, што заўсёды прывівала дзецям любоў да роднай мовы і літаратуры, рыхтавала да самастойнага жыцця... Вельмі хацела, каб усе мае вучні выбралі сабе цікавыя прафесіі, каб стварылі добрыя сем'і, каб захавалі ў сэрцах дабрыню — жылі сярод людзей як людзі.**



Цяпер я на заслужаным адпачынку. Часта гуляю па горадзе, люблю пасядзець на лавачцы, пад ліпамі ў нашым прыгожым утульным парку (побач — царква), часта сустракаюся са сваімі (былых не бывае!) вучнямі. Адзін з іх, Канстанцін Кавалёў, пахваліўся, што нядаўна прыехаў з Італіі, што наведваў там сям'ю, у якой гасцяваў у дзяцінстве.

...Тады, на рубяжы стагоддзяў, па так званай чарнобыльскай праграме, многіх дзяцей вывозілі на аздараўленне ў Германію, Латвію, Расію, на Каўказ... Канстанцін трапіў у Італію, жыў там у сям'і Дантэ, купаўся ў моры, змог умацаваць здароўе, пабачыць свет... І — ці ж не малайчына?! — не забыўся на гэта: падтрымліваў сувязь са сваімі гаспадарамі, а потым, ужо дарослым самастойным чалавекам, адважыўся, знайшоў магчымасць, і зноў наведаў.

Расказваў, што сустрэлі яго (не адразу, праўда, пазнаўшы) у Падуі, што з вялікай радасцю павезлі дадому.

Жыве сям'я гаспадароў у сельскай мясцовасці, у глыбінцы, у двухпавярховым белым доме пад чарапічным дахам, разам з родзічамі трымае некалькі ферм, абрабляе зямлю. Дарослыя дзеці, сыны двух братоў, дапамагаюць бацькам.

Прыезджага, Канстанціна, пасялілі ў тым самым пакоі (толькі пасля рамонту), што і некалі раней. Казаў, што ў яго за вокнамі была ўсё тая ж прыгажосць і простае сялянскае жыццё.

Гаспадар Флавія ледзь не адразу ж наладзіў госцю экскурсію па сваіх фермах, па гаспадарцы.

Шмат мерапрыемстваў запланавала і арганізавала гаспадыня Луіза: амаль кожны дзень былі паездкі да мора, наведванне славутых мясцін, кафэ і рэстаранаў з італьянскай кухняй, сустрэчы з многімі сваякамі, якіх госць (тады — хлапчук) не бачыў... дваццаць пяць гадоў.

Казаў, што асобныя з італьянцаў змяніліся больш: нехта вырас, нехта пастарэў, але, здаецца, усе засталіся такімі ж вясёлымі, бадзёрымі, улыбёнымі ў жыццё. Госцю з Беларусі, з мінулага, рады былі ўсе: распытвалі пра жыццё-быццё, пра нашу краіну.

Канстанціну пашчасціла пазнаёміцца з жонкай і дзецьмі Матэа, старэйшага сына сваіх гаспадароў. Малодшы, Андрэа, пакуль не жанаты, але яго дзяўчына досыць часта прыходзіць у госці і пачуваецца амаль як дома.

...А ўсё, напэўна, таму, што ў гэтай сям'і пануе атмасфера спагады і дабрыні, любові і павагі адзін да аднаго: старэйшых — да малодшых, малодшых — да старэйшых.

І вось гэта — як тыя ж фермы, як справа жыцця, як рухомая і нерухомая маёмасць — перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Прыклад, згадзіцеся, варты пераймання.

**С. А. Мядзведзева,**
*г. Лельчыцы.*

Была вайна

# «Без партызанскіх атрадаў нам не абысціся»

### Героя Савецкага Саюза генерал-маёра Васіля Каржа землякі нездармa называлі Васіль Мудры

**Нарадзіўся ён у пачатку мінулага стагоддзя на сённяшняй Салігоршчыне ў простай сялянскай сям'і. Свой першы баявы вопыт набыў у партызанскай барацьбе ў Заходняй Беларусі, выбіраўся старшынёй калгасаў у Слуцкім і Старобінскім раёнах. Пасля заканчэння спецкурсаў некалькі гадоў працаваў у органах НКУС, удзельнічаў у грамадзянскай вайне ў Іспаніі. І таму з пачаткам Вялікай Айчыннай, ужо загадчыкам сектара Пінскага абкама КП(б) Беларусі, адразу прызнаў, што гэта вайна надоўга і што ў ёй не абысціся без партызанскіх атрадаў.**

Першы з іх, атрад Камарова з 60 чалавек, быў арганізаваны ў першы ж дзень вайны.

Народныя мсціўцы, напачатку ўзброеныя толькі вінтоўкамі і гранатамі, грамілі нямецкія гарнізоны, знішчалі сродкі сувязі. У сярэдзіне сакавіка 1942-га арганізавалі адзін з першых рэйдаў, у ходзе якога, паводле ўспамінаў В. З. Каржа, было разгромлена некалькі паліцэйскіх участкаў, у насельніцтва ўмацавалася вера ў перамогу, стварылася легенда аб існаванні рэгулярнай вайсковай часці. Да лістапада гэтага ж года сем вялікіх па сіле атрадаў утварылі партызанскае злучэнне, а пасля — на стыку Мінскай, Пінскай, Палескай абласцей — і вялікую партызанскую зону.

...З лютага 1943 года гітлераўскае камандаванне спрабавала расквітацца з народнымі мсціўцамі. Супраць злучэння Каржа кідаліся ўсё новыя і новыя сілы з артылерыяй, самалётамі, танкамі. І кожны раз партызаны прарывалі акружэнне. Усяго да ліпеня 1944 года яны разграмілі больш за шэсцьдзесят буйных нямецка-фашысцкіх гарнізонаў, знішчылі пяць чыгуначных станцый і дзесяць эшалонаў з баявой тэхнікай і боепрыпасамі. Акрамя таго, пінскія падрыўнікі на розных участках чыгункі пусцілі пад адхон 468 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, абстралялі 219 варожых эшалонаў і ўзарвалі 23 616 чыгуначных рэек. За ўзорнае выкананне заданняў камандавання ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у тыле праціўніка і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства ў жніўні 1944 года В. З. Каржу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

...У мірны час Васіль Захаравіч скончыў Ваенную акадэмію, працаваў намеснікам міністра лясной гаспадаркі, на роднай Салігоршчыне ўзначальваў калгас «Партызанскі край». Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, шматлікімі медалямі. Імем яго названы вуліцы ў Мінску, Пінску, Салігорску, Давід-Гарадку, Лунінцы, Слоніме, школа ў Пінску. Пра легендарнага партызанскага камандзіра і яго паплечнікаў зняты двухсерыйны фільм «Трэцяга не дадзена». У аграгарадку Хоростава ўстаноўлены помнік В. З. Каржу, адкрыты Музей партызанскага краю.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

Усмешачку

# ДАРАГАЯ ВОЛЬГА СЯРГЕЕЎНА

**Мая новая суседка — настаўніца, прычым не проста — а, мусіць, яшчэ і класная, у шырокім сэнсе гэтага слова, бо расказвала, як аднойчы на сваім стале знайшла самаробную паштоўку, як прачытала там кранальнае: «Увесь чацвёрты клас любіць вас, Вольга Сяргееўна!»**

Дарагое прызнанне: такое — як ёй здалося — проста грэх схаваць у шафу! Настаўніца пакінула яго на стале.

Назаўтра на паштоўцы з'явілася прыпіска, і тэкст стаў чытацца так: «Увесь чацвёрты клас любіць вас, Вольга Сяргееўна! За выключэннем двух чалавек».

«Не ведаю, хто гэта высвятляў, хто напісаў і хто тыя два чалавекі, — са смехам казала настаўніца, — але ж хочацца верыць, што некалі, праз гады, мы з вучнямі абавязкова сустрэнемся, усё гэта ўспомнім і як жа хораша, дружна будзем смяяцца...»

Хай збываюцца мары настаўнікаў! Асабліва — дарагія і любімых!

**А. Чайкоўская,**
*г. Гомель.*

Дзейныя асобы

# «НЕ ТРЭБА ЖЫЦЬ ЯК НАБЯЖЫЦЬ...»

**Нашы продкі прыкмячалі, што сваё гняздо ўсялякай птушцы міла: вяртаюцца яны з выраю... Як вяртаюцца на радзіму дзеці, а ў школы — яе выпускнікі.**

**Найчасцей, мусіць, праз год пасля выпуску? Здараецца, што праз пяць, дзесяць, нават дваццаць. А вось праз пяцьдзясят... У нашай, Капланецкай сярэдняй школе, такое здараецца.**

**Што здзівіла, адну з нядаўніх сустрэч (у тым ліку з першай настаўніцай Верай Піліпаўнай Вяргейчык) арганізавала выпускніца Вольга Калясень.**

Гэтая, здавалася б, нічым такім не адметная дзяўчынка, хадзіла ў дзявяты клас, калі на рабоце загінуў бацька. На руках у матулі засталося пяцёра сірот.

У гады вайны і адразу пасля яе многія ўдовы, гледзячы адна на адну, спраўляліся з падобнымі ношамі. Але ж не ўсе — і тады, і тым больш пазней.

Не вытрымала і матуля Вольгі: на яе, старэйшую з дачок, пакінула малодшых брацікаў і сястрычак. Жыві як зможаш... А як, калі ні сілы, ні сродкаў, ні жыццёвага вопыту?

Сваякі тады забілі трывогу, прычыніліся і ўлады: 4-гадовую Іну і 14-гадовую Марыю пакінулі на старэйшую сястру, 10-гадовага Колю і 9-гадовую Зою вырашылі забраць у школу-інтэрнат.

Вольга ім усё патлумачыла, сама адвезла малых у Беразіно і пакінула, — на перакладных дабралася дадому.

А ўслед за ёй гадзіны праз дзве туды ж прыехалі Коля і Зоя. «Хто вас пусціў? Як, на чым вы дабраліся?» — стала распытваць Вольга. «А мы ўцяклі, — пахваліліся дзеці. — Мы не хочам там жыць».

Трэба аддаць належнае работнікам установы: яны хутка агледзелі прапажу і праз гадзіну-другую былі ўжо ў хаце сірот. Зоя з Колем, зразумеўшы, што гэтыя людзі прыехалі па іх, забіліся пад ложак і вылазіць адтуль ніяк не хацелі! Усе разам ледзьве ўгаварылі!

...Аб тым, каб пасля школы вучыцца далей, Вольга ўжо не марыла: трэба было глядзець, гадаваць дзяцей, зарабляць грошы.

Свет не без добрых людзей: кемлівую і старанную дзяўчыну запрасілі працаваць паштальёнам, а пазней — начальнікам невялікай ашчаднай касы. Вольга спраўлялася і сталела. А неяк на танцах апынулася ў пары з Віктарам Старынскім, хлопцам з суседняй вёскі, які аказаўся не толькі маладым і сімпатычным, але і дастаткова смелым: нягледзячы на «пасаг» у выглядзе брата і сястрычак, паклікаў дзяўчыну замуж.

Па прафесіі ён быў трактарыстам, вельмі прыстойным, паважлівым да людзей і вельмі працавітым. Дапамогі яму таксама чакаць не даводзілася (рос без бацькі), таму ўсё рабіў сам. Калі нейкую жэрдку ці плаціну прынесці не мог — прывязваў да матацыкла і цягнуў дадому.

Так паціху, памалу і ладкаваў свой быт, свой дом. А пры ім будаваліся хлявы для каня і каровы, хлеўчыкі для свіней, індыкоў, гусей і курэй, а галоўнае — раскошная лазня, дзверы якой былі адчынены для ўсіх ахвотных.

Не дзіва, што ў вёсцы вельмі паважалі гэтую дружную, працавітую сям'ю, што Вольгу з Віктарам запрашалі на многія сямейныя святы, заслухоўваліся іх чароўнымі галасамі, любаваліся на пару ў танцах.

І на рабоце цанілі. Былы старшыня калгаса «Бярэзінскі» Мікалай Пятровіч Грынкевіч казаў, што, калі б яму ў брыгаду яшчэ трох чалавек такіх, як Віктар Старынскі, Уладзімір Ляшкоў і Уладзімір Баранаў, іншых трактарыстаў можна было б зусім распусціць.

Жыццё — нарэшце — стала ўсміхацца ім (у сям'і, апроч «пасажных» дзяцей, падрасталі ўласныя), але ж сёстрам Вольгі хацелася для радні большага і лепшага. Адна з іх, працуючы бухгалтарам у досыць багатай гаспадарцы Смалявіцкага раёна, стала падбіваць сям'ю на пераезд. Там для маладых працаўнікоў і сапраўды выдзяляліся новыя двухпавярховыя катэджыкі з усімі выгодамі і пабудовамі, з гаражамі, з вымашчанымі пліткай дарожкамі, з вялікімі ўчасткамі зямлі... Толькі перазджай — на ўсё гатовае, толькі працуй і жыві.

З аднаго боку, гэта не магло не вабіць (колькі ж можна гаравацца на рабоце і дома?!), з другога — тут, на «наседжаным» месцы, была работа, сябры-суседзі, аўтарытэт.

...Нялёгка давалася гэтае рашэнне, але Віктар згадзіўся на пераезд: пачаў, так бы мовіць, спачатку і потым, казалі, моцна пашкадаваў: сумаваў па сваім ужо прададзеным доме, па сваіх людзях, казаў, што гатовы жыць у любым будане, але на беразе роднай рэчкі, што на чужыне і камар загіне...

Як у ваду глядзеў. Пахавала Вольга свайго чалавека.

Не паспела ачомацца ад гэтай непапраўнай бяды, як звалілася новая: не дажыўшы двух месяцаў да рэгістрацыі шлюбу, трагічна загінуў малодшы сын.

Як было змірыцца і не крануцца розумам? Дзе браць сілы?

Не адразу, але ж канчаткова зразумела, што ў мінулым — як бы ні стаaралася! — анічога ўжо не паправіць. Трэба неяк жыць далей: працаваць, клапаціцца пра сваіх — і блізкіх і далёкіх, ладзіць святы... Ну чаму б і не?

...На сустрэчу аднакласнікаў (выпуск 1974 года!) прыехала чалавек 15. Пабачыліся, пагаварылі, падзякавалі настаўнікам, і, вядома ж, Вользе Старынскай, так шчодра надзеленай любоўю да людзей, да жыцця.

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Третьи повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 28.08.2024 в газете «Звязда» № 167 (30301), стр. 15**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование (назначение), адрес | Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб. | Минимальная цена, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | Мотодепо, корпус № 62, место расположения: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 102/50 | 63 000,00 | 18 000,00 |
| **2** | Автомобильный прицеп-цистерна б/у вместимостью 3 куб. м | 789,60 | 225,60 |
| **3** | Прицеп бортовой МАЗ-8926 1988 г. в., кузов (рама) № 872575, регистрационный знак 5161 АА-6 | 2 352,00 | 672,00 |
| | **Первые публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области** | | |
| 4 | Кран опорный Г-П 2.0 ТН Л-6М, бывший в эксплуатации | 3 960,00 | 2 772,00 |
| 5 | Электрокран-Балка 3,2 Т, бывший в эксплуатации | 4 080,00 | 2 856,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **2 % – 4 % от цены продажи лота, в зависимости от цены продажи лота**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):**
**По лотам №№ 1–3:** 09.10.2024,
начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00.
Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 25.09.2024 по 08.10.2024 до 16.00.
**По лотам №№ 4, 5:** 25.10.2024,
начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00.
Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 25.09.2024 по 24.10.2024 до 16.00.
Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении **28 октября 2024 года** повторных торгов с условиями по продаже торговых помещений в г. Жодино

| **Предмет торгов** |
|---|
| Изолированное помещение с инвентарным номером 612/D-19448 общей площадью 534,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, пр. Мира, д. 19а, помещение № 1 (1 этаж) (назначение: **торговое помещение**); изолированное помещение с инвентарным номером 612/D-19431 общей площадью 184 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, г. Жодино, пр. Мира, д. 19а, помещение № 1 (цокольный этаж) (назначение: **торговое помещение**) |
| Начальная цена: 1 175 300,00 бел. руб. |
| Сумма задатка: 70 000,00 бел. руб. |

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Продавец имущества (собственник):** Атрахимович С.И., гражданин Республики Беларусь.

**Условие торгов (условие продажи):** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже торговых помещений в г. Жодино, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по продаже торговых помещений в г. Жодино.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за один календарный день до наступления даты проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **28 октября 2024 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.09.2024 по 23.10.2024 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (по вопросам участия в аукционе и ознакомления с имеющейся документацией);**
**(029) 676-17-17**
**(по вопросу осмотра продаваемого имущества и иным вопросам).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Гражданин РБ Роговский Виталий Валентинович |

**Предмет электронных торгов – имущество, реализуемое одним лотом.**
Адрес: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Промышленная, 13, 13/11, 13/6

**Склад семян** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. № 255/С-11521, общ. пл. 1884 $м^2$.
**Блок вспомогательных помещений** (здание обрабатывающей промышленности иного назначения), инв. № 255/С-11526, общ. пл. 291 $м^2$, сост. части и прин-ти: навес.
**Весовая** (здание обрабатывающей промышленности иного назначения), инв. № 255/С-11523, общ. пл. 52 $м^2$, сост. части и прин-ти: два навеса.
Сведения о земельном участке 1: общ. пл. 0,5208 га предоставлен продавцу на праве аренды по 08.10.2122 для строительства и обслуживания капитального строения с инв. № 255/С-11521, склад семян.
Сведения о земельном участке 2: общ. пл. 0,1709 га предоставлен продавцу на праве аренды по 08.10.2122 для строительства и обслуживания капитального строения с инв. № 255/С-11526, блок вспомогательных помещений.
Сведения о земельном участке 3: общ. пл. 0,0587 га предоставлен продавцу на праве аренды по 08.10.2122 для строительства и обслуживания капитального строения с инв. № 255/С-11523, весовая

**Начальная цена, без НДС – 70 000 долл. США***
** Расчет по договору купли-продажи будет производиться в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату проведения платежа*

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.10.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **25.10.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Премьерлизинг»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 07.10.2024.**

### Лот № 1:
### Магазин с инв. № 400/D-23124.

Согласно ведомости технических характеристик (далее – ВТХ): площадь – 782,8 кв. м.

Адрес:
**Гродненская обл., г. Гродно, ул. Стефана Батория, 6-41.**

Магазин с инв. № 400/D-23124 находится в кап. строении с инв. № 400/С-346, расположенном на земельном участке 440100000002000750 площадью 0,1381 га.

Обременения: ипотека, аренда. На момент объявления торгов на предмет электронных торгов отсутствует технический паспорт, вместо которого выдана ВТХ. Подписание договора купли-продажи и его регистрация возможны только при условии приведения предмета торгов в соответствие с Инструкцией, утвержденной Постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 24.03.2015 № 11, и получения согласия залогодержателя, поручителей по договору об ипотеке Продавцом. Организатор электронных торгов и Продавец не несут ответственности за незаключение договора купли-продажи с Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) по причине, вызванной обстоятельствами, изложенными выше.

Начальная цена с НДС 20 % – 572 000,00 долларов США.
Задаток – 183 909,44 руб. **Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **03.10.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

Общество с ограниченной ответственностью «Житковичи милл» с 11 июля 2024 года осуществляет свою деятельность без печати.

ООО «Житковичи милл» информирует, что с 16 июля 2024 года юридический адрес предприятия – 224016, г. Брест, ул. Куйбышева, 13Г, часть помещения 42.

УНП 490986644

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ЛОГОЙСКИМ СЕЛЬСКИМ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫМ КОМИТЕТОМ (организатор аукциона) по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Августово, ул. Высокая, 12, кадастровый номер 623284600201000334 | 0,1323 | Электрификация, водоснабжение | 22 000,00 | 2 200,00 | 2 623,51 + расходы за размещение объявления |
| 2 | д. Зеленый Луг, ул. Центральная, кадастровый номер 623284602601000157 | 0,1215 | Электрификация, водоснабжение, газофикация | 30 000,00 | 3 000,00 | 2 585,36 + расходы за размещение объявления |
| 3 | аг. Косино, ул. Школьная, 85Б кадастровый номер 623284603601000113 | 0,1494 | Электрификация, водоснабжение, газоснабжение | 8 000 | 800,00 | 2 391,37 + расходы за размещение объявления |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 28 октября 2024 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6, Логойский сельский исполнительный комитет, контактные. тел.: (801774) 28473, (8029) 1779511.
**Прием документов** по 23.10.2024 включительно.

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Минского областного исполнительного комитета: http://minsk-region.gov.by/ekonomika-i-finansy/zemelnye-uchastki-01/, Логойского районного исполнительного комитета: http://www.logoysk.gov.by/

УНП 600537220

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# БАЛЮЧА, ДОЎГА І НЕНАДЗЕЙНА?

## Развенчваем міфы пра імплантацыю зубоў

**Нягледзячы на тое, што методыка імплантацыі распрацавана яшчэ ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя, многія мірацца з адсутнасцю зубоў, лічачы, што ўстаноўка імплантаў — гэта балюча, патрабуе шмат часу і выдаткаў. Насамрэч імплантацыя — самы фізіялагічны і надзейны спосаб аднавіць страчаныя зубы. Імплант — гэта зуб, устаноўлены на месцы страчанага. Калі паглыбляцца падрабязней, то сам імплант — аналаг кораня зуба, а на яго ўсталёўваецца штучная каронка. Колькі насамрэч часу займае іх устаноўка? Ці падыходзіць імплантацыя пажылым людзям? Якія супрацьпаказанні? Ці праўда, што імпланты могуць не прыжыцца? Якога догляду яны патрабуюць? Пра гэта расказаў хірург-імплантолаг Яўген СТРАНГЕЛЬСКІ.**



***— Яўген Вікенцьевіч, ці трэба аднаўляць тыя страчаныя зубы, якіх не відаць? Да якіх наступстваў прыводзіць недахоп зубоў?***

— Страчаныя зубы аднаўляць неабходна, бо іх адсутнасць можа прывесці да дэфармацыі зубнога раду не толькі на той сківіцы, дзе знаходзіўся зуб, але і на процілеглай. У будучыні гэта прывядзе да большых расходаў на аднаўленні зубнога раду. Акрамя таго, будзе адбывацца атрафія косці (змяншэнне яе аб'ёму) у вобласці згубленага зуба — з кожным годам на 15-20 працэнтаў, што зноў жа прывядзе да лішніх выдаткаў па ўзнаўленні страчанага зуба.

***— Многія мірацца з адсутнасцю зубоў, лічачы, што імпланты — гэта дорага, балюча і ненадзейна. Колькі можа праслужыць імплант і ці патрэбна іх перыядычная замена? Колькі па часе займае яго ўстаноўка?***

— Усё залежыць ад досведу і кампетэнтнасці ўрача, у тым ліку і час устаноўкі імпланта, і тэрмін яго службы. Гэтак жа вялікае значэнне мае тытан, з якога зроблены імплант — так званы grade. Найбольш эфектыўны і чысты тытан маркі 4 grade, ён валодае высокай трываласцю і прыжывальнасцю.

Як правіла, імплант можа праслужыць усё жыццё, але шмат залежыць ад самога пацыента. Адыгрываюць ролю лад жыцця, агульнае саматычнае здароўе, наяўнасць шкодных звычак, гігіена. Акрамя таго, важна прыбраць траўмавальныя фактары ў поласці рота: цвёрдую ежу, зубную шчотку моцнай цвёрдасці, выкарыстанне драўляных зубачыстак. І строга прытрымлівацца рэкамендацый урача.

***— У цяперашні час імплантацыя — самая перадавая тэхналогія. Ці існуе ўжо нешта новае і сучаснае?***

— На дадзены момант гэта самая даступная і перадавая тэхналогія па аднаўленні зубнога раду ў вобласці аднаго або некалькіх адсутных зубоў.

Ёсць і методыка ўзнаўлення зубнога раду, калі адсутнічаюць усе зубы ці выдаляюцца нежыццяздольныя. Тады ўстанаўліваецца чатыры ці шэсць імплантаў (на іх і будзе ісці ўся нагрузка) і на працягу пяці—сямі працоўных дзён вырабляюцца пратэзы на ўсю сківіцу. Пры такой методыцы чалавек не выпадае са свайго звыклага рытму надоўга і якасць жыцця захоўваецца на высокім узроўні.

***— Раскажыце пра этапы імплантацыі: колькі па часе займае кожны з іх і якія работы выконваюцца?***

— Звычайна пацыент прыходзіць на кансультацыю з конусна-прамянёвай камп'ютарнай таматрафіяй (так званы 3D-здымак), гэта першы этап. На другім устанаўліваецца імплант. У залежнасці ад складанасці, а тут усё вельмі індывідуальна, гэта займае ад 40 хвілін да некалькіх гадзін (калі гаворка ідзе пра ўстаноўку некалькіх імплантаў). На трэцім этапе здымаюцца швы.

Далей звычайна праз 2-3 месяцы робіцца кантрольны 3D-здымак, і пацыент прыходзіць на пратэзаванне. У гэты ж дзень можна зрабіць сканаванне ў поласці рота, калі для работы па лічбавым пратаколе замест злепкаў у поласці рота робіцца здымак, што паляпшае якасць і змяншае тэрміны выпрабу канструкцыі.

Калі пры адсутнасці ўсіх зубоў выкарыстоўваецца методыка з устаноўкай імплантаў «Усе на 4/6», пра што я казаў вышэй, то гатовы пратэз адзяваецца на трэцім этапе, пасля зняцця швоў. Пацыент атрымлівае рэкамендацыі па доглядзе і выкарыстанні дадзенага пратэза. Напрыклад, з ім нельга надкусваць і перажоўваць цвёрдую ежу, але затое можна смела размаўляць і ўсміхацца. Трэба сказаць, што такі пратэз лічыцца часовым і падлягае абавязковай замене праз 1-1,5 года на аналагічны, але ён ужо больш шчыльна прылягае. І вось ён ужо будзе пастаянным.

***— Часовы пратэз ставіцца толькі пры такой методыцы? Ці магчыма яго ўстаноўка, калі аднаўляецца ўсяго адзін зуб? Усё ж паміж устаноўкай імпланта і самога пратэза праходзіць два—тры месяцы...***

— Яны дапушчальныя, калі імплант ставіцца ў эстэтычна важнай зоне, напрыклад, гэта пярэдні зуб ці іншы ў зоне ўсмешкі (чацвёты, пяты і нават шосты). Але кусаць ежу такімі зубамі нельга тры месяцы, яны выключна для ўсмешкі і прыгажосці.

***— Ці ёсць супрацьпаказанні да імплантацыі? Ці можна яе рабіць пажылым людзям?***

— Супрацьпаказанні ёсць абсалютныя і адносныя. Узрост не з'яўляецца супрацьпаказаннем да імплантацыі. Абсалютнымі супрацьпаказаннямі могуць быць толькі хранічныя захворванні. Сярод іх — парушэнні згусальнасці крыві, псіхіятрычныя захворванні, эпілепсія, зніжаны імунітэт, злаякасныя наватвораннi.

Цукровы дыябет, напрыклад, з'яўляецца адносным супрацьпаказаннем і не выключае ўстаноўку імпланта, гэта вырашаецца на кансультацыі ўрача.

Найбольш небяспечным фактарам да адарвання імплантаў з'яўляецца курэнне. Неабходна або скарачаць яго ў два разы, або наогул адмовіцца ад дрэннай звычкі.

***— Якія бываюць пабочныя эфекты пасля ўстаноўкі імпланта?***

— Пры іх устаноўцы неабходна дакладна выконваць медыкаментозны пратакол, які рэкамендаваны Міністэрствам аховы здароўя. Звычайна на другія-трэція суткі назіраюцца невялікія ацёкі, але яны хутка праходзяць. Вельмі рэдка здараецца павышэнне тэмпературы, можа быць невялікая болевая рэакцыя, але звычайна яна купіруецца прыёмам нестэроідных супрацьзапаленчых прэпаратаў.

У поласці рота багатая мікрафлора, як добрая, так і дрэнная, таму, каб не далучылася інфекцыя, неабходны прыём антыбіётыкаў. Акрамя таго, рэкамендуецца прымяняць антысептычныя мазі і растворы.

***— Ці праўда, што імпланты часта не прыжываюцца?***

— На пачатковым этапе развіцця імплантацыі, а імпланты ставяць у нас у краіне з 1986 года, такое здаралася. Аднак з тых часоў усё істотна змянілася: тытан стаў значна чысцейшым, памянялася методыка ўстаноўкі. Сёння рызыка адарвання імплантаў складае ўсяго 1-2 працэнты. Аднак гэта не адмяняе таго, што неабходна выконваць рэкамендацыі ўрача, каб не трапіць у гэтыя працэнты.

***— Ці ёсць правілы эксплуатацыі для імплантаваных зубоў альбо іх можна выкарыстоўваць як родныя?***

— Калі ўсталяваны адзін або больш імплантаў, неабходна якасная гігіена поласці рота — яшчэ лепшая, чым была ў вас раней. Рэкамедуецца дадаткова выкарыстоўваць зубныя ніткі, розныя ёршыкі, ірыгатар.

Бацькам на заметку

# У СПАДЧЫНУ НЕ ПЕРАДАЕЦЦА

## Як абараніць малочныя зубы ад карыесу?

**Лічыць малочныя зубы чымсьці нявартым увагі — небяспечная бацькоўская памылка. Нягледзячы на тое, што рана ці позна яны зменяцца, берагчы іх ад карыесу неабходна, інакш у будучыні здаровай усмешкі дзіцяці не відаць. Пра распаўсюджаныя бацькоўскія памылкі расказвае загадчык стаматалагічнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Алена ВЫСОЦКАЯ.**



— Многія мамы і таты мяркуюць, што калі іх зубы добрыя, то і ў дзіцяці праблем не будзе, а калі наадварот, то карыес непазбежны. У дадзеным выпадку бацькі не зусім маюць рацыю, — кажа Алена Дзмітрыеўна. — Карыес — інфекцыйны працэс, які выклікаецца пэўнымі, так званымі карыесагеннымі мікраарганізмамі, якія ферментуюць на працягу досыць доўгага часу вугляводы ежы з утварэннем кіслот ва ўмовах нізкай устойлівасці эмалі зубоў. Менавіта апошні фактар вызначаецца хімічным складам і спадчыннасцю. Усё астатняе — вынік уздзеяння навакольнага асяроддзя і ладу жыцця.

Таму варта памятаць, што першым і галоўным спосабам прафілактыкі карыесу з'яўляецца барацьба з карыесагеннымі мікраарганізмамі. Бацькі павінны папярэдзіць іх траплянне ў рот дзіцяці. Калі ж інфіцыраванне ўжо адбылося, то пастарацца знізіць іх колькасць і агрэсіўнасць.

— Заражэнне дзіцяці карыесагеннымі мікраарганізмамі адбываецца пры трапленні ў яго рот сліны чалавека, які мае іх у вялікай колькасці. Гэта адбываецца пры аблізванні соскі, смакаванні ежы з лыжкі, перажоўванні ежы перад тым, як даць яе дзіцяці, пацалунках, аблізванні пальчыкаў малога, якія ён потым возьме ў рот. Найбольш часта такім чалавекам аказваецца маці, на другім месцы — бабулі і нянькі. Многія мамы непакояцца, што пазбегнуць «сліннага» кантакту з дзіцем немагчыма. У такім выпадку трэба прыняць меры па зніжэнні ўзроўню гэтых мікраарганізмаў у сліне маці, — звяртае ўвагу стаматолаг.

У першую чаргу неабходна яшчэ да родаў прывесці ў парадак свае зубы, старанна выконваць гігіену поласці рота, выкарыстоўваць зубную пасту з фтарыдам, хлоргексідзінам або ксілітам. Пасля пачатку прарэзвання зубоў у дзіцяці маці можа на працягу аднаго месяца выкарыстоўваць апаласквальнік для поласці рота з хлоргексідзінам і рэгулярна ўжываць сродкі з ксілітам (жавальныя гумкі, пасцілкі, дражэ).

— Ксіліт — гэта каларыйны цукразаменнік, які не выкарыстоўваецца бактэрыямі для выпрацоўкі кіслот, а таксама прыкленйванню да паверхні зубоў. Пры выкананні ўсіх гэтых мер колькасць карыесагенных бактэрый у ротавай поласці маці зніжаецца, і пры выпадковым трапленні яе сліны ў рот дзіцяці рызыка заражэння зніжаецца ў значнай ступені, — тлумачыць Алена Высоцкая.

Другім важным кампанентам, які спрыяе развіццю ранняга дзіцячага карыесу, з'яўляецца карыесагеннае харчаванне. Сюды адносяцца цукры ў напоях, малацэ і дзіцячых малочных сумесях у перыяды як начнога, так і дзённага сну; высокая частата спажывання цукраў з напояў і цвёрдай ежы; выкарыстанне бутэлечкі для кармлення і заспакаення, звычкі смактання; працяглае кармленне.

Адным з галоўных прафілактычных метадаў ранняга дзіцячага карыесу з'яўляецца старанная гігіена поласці рота малога. З моманту прарэзвання першага зуба яго трэба праціраць сурвэткай ці мяккай тканінай, змочанай у вадзе ці адвары рамонку. Пасля поўнага прарэзвання каронак першых зубоў можна пачынаць іх чысціць дзіцячай зубной шчоткай, прызначанай для дзяцей гэтага ўзросту. Падчас чысткі шчоткай варта здзяйсняць «падмятальныя» рухі ад дзясны да рэжучага краю зубоў або кругавыя рухі. Лепш гэта рабіць раніцай пасля сняданку і ўвечары перад сном. З аднаго года можна пачынаць ужыванне зубной пасты, якая выпускаецца для дзяцей гэтага ўзросту.

Пры вытворчасці такіх паст улічваецца факт, што дзеці яшчэ не ўмеюць сплёўваць, і таму ў іх састаў уключаюцца кампаненты, якія валодаюць нераздражняльным слізістую абалонку дзеяннем.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133. УНП 600048660 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: здание магазина**
(здание нежилое, инв. номер 614/С-18963, **78,5 кв. м,** составные части: пристройка).
Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Пекалинский с/с, д. Вызволенье**

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. **0,0956** га для строительства и обслуживания магазина № 54

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 5 970,00 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Лот № 2: здание магазина**
(здание нежилое, инв. номер 614/С-18975, **84,3 кв. м,** составные части: холодная пристройка, два сарая).
Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Курганский с/с, д. Потичево**

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве постоянного пользования общ. пл. **0,1513** га для строительства и обслуживания магазина № 104

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 5 900,00 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Лот № 3: магазин № 59**
(здание специализированное розничной торговли, инв. номер 614/С-53065, **100,3 кв. м,** составные части: две пристройки, уборная,сарай).
Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Драчковский с/с, д. Дехань, ул. Центральная, 28**

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве аренды (срок действия по 14.09.2050) общ. пл. **0,1106** га для обслуживания магазина № 59. Ограничения (обременения) прав на земельный участок: зона санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, зона санитарной охраны в местах водозабора

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 21 000,00 бел. руб.**

**Лот № 4: здание магазина**
